ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СУБОТА, 23 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 40 (382)

ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Напярэдадні першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР

25 ліпеня ў Менску адкрыецца першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР. Абраннікі беларускага народа, закліка्ныя да ўлады на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, на аснове самых дэмакратычных у свеце выбараў, прыступяць да дзяржаўнай работы.

99,65 процанта ўсіх выбаршчыкаў Совецкай Беларусі прышлі 26 чэрвеня да выбарчых урнаў, каб выказаць сваю волю. 99,19 процанта ўсіх прыняўшых удзел у галасаванні аддалі свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Галасуючы за блок комуністаў і беспартыйных, працоўныя Совецкай Беларусі прадэманстравалі сваё ідэйна-палітычнае і маральнае адзінства, сваю аднадушнасць і згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна і совецкага ўрада, сваю беззаветную адданасць радзіме, партыі, вялікаму Сталіну.

У выніку бліскучай перамогі сталінскага блока комуністаў і беспартыйных у склад вышэйшага органа Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі абраны лепшыя людзі, усё сваё жыццё аддаючыя на барацьбу за шчасце народа, выпрабаваныя і загартаваныя ў змаганні з ворагамі працоўных, беззаветна адданыя справе соцыялізма.

Разам з усенародным абраннікам, тварцом нашай Канстытуцыі таварышам Сталіным у склад Вярхоўнага Совета БССР уваходзяць яго лепшыя саратнікі, палітычныя дзеячы, барацьбіты за справу соцыялізма — члены Палітбюро Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Мікаян, Ежоў, Андрэеў, Жданаў. Разам з імі да вырашэння вялікіх дзяржаўных задач закліканы сталінскія выхаванцы, сярод іх партыйныя і совецкія работнікі, стаханаўцы соцыялістычнай прамысловасці і калектывізаванай сельскай гаспадаркі, вучоныя, інжынеры, урачы, кампазітары, настаўнікі, работнікі нашай доблеснай Чырвонай Арміі, знатныя героі-пагранічнікі. Іх імёнамі ганарыцца наша краіна, у іх біграфіях — гісторыя перамог беларускага народа.

У сваім выступленні на сустрэчы з выбаршчыкамі дэпутат Вярхоўнага Совета БССР кампазітар тав. А. Е. Туранкоў гаварыў: «Наша Совецкая Беларусь законна ганарыцца сваімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, музыкальнымі школамі, дзяржаўнай кансерваторыяй, сваімі тэатрамі, кіно, радыё. Совецкая Беларусь законна ганарыцца сваімі дасягненнямі ва ўсіх галінах прамысловасці, сельскай гаспадаркі і мастацтваў.

Новыя песні спявае вызвалены беларускі народ — песні аб радасці і шчасці народным, песні аб вялікім Сталіне — лепшым другу беларускага народа.

Мая заветная мара стаць кампазітарам магла быць ажыццёўлена толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. З таго часу я пішу музыкальныя творы, якія апяваюць вызвалены совецкі народ, радасць і шчасце працоўных Совецкай Беларусі».

У гэтых словах — мары і пачуцці ўсіх працоўных. Пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна лепшыя сыны нашага народа аддалі сваё жыццё за тое, каб здабыць свабоду сваёй краіне, каб над плоданоснай зямлёю нашай краіны заззяла сонца соцыялістычнай рэволюцыі.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, з дапамогаю вялікага рускага народа, які першым узняў сцяг пабеданоснай соцыялістычнай рэволюцыі, беларускі народ атрымаў свабоду і выйшаў на шырокі шлях нацыянальнага адраджэння, гаспадарчага і культурнага росквіту. Квітнее беларуская культура — нацыянальная па форме і соцыялістычная па зместу, шырока раскрываюцца творчыя здольнасці народа, расце беларуская літаратура, растуць кадры літаратурна-мастацкага фронта, вызваленая навуковая мысль авалодвае вышынямі ведаў, паспяхова пранікае ў тайнікі прыроды, самую прыроду ставіць на службу працоўнаму чалавецтву.

Пісьменнікі і работнікі мастацтваў актыўна ўдзельнічалі ў выбарах у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР. Яны мастацкімі сродкамі агітавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за перамогу гэтага блока. Працоўныя Совецкай Беларусі заклікаюць пісьменнікаў і работнікаў мастацтваў працаваць з яшчэ большым энтузіязмам над стварэннем высокамастацкіх твораў, адлюстроўваючых веліч Сталінскай эпохі.

Народ прышоў да выбараў свайго вышэйшага органа ўлады ідэйна, палітычна і маральна адзіным; на выбарах перамог блок комуністаў і беспартыйных. Гэта велізарнай важнасці змена ў развіцці грамадства з'яўляецца невычарпальнай крыніцай натхнення для майстроў мастацкага слова і кісці. Яны павінны паказаць у яркіх і поўнацэнных мастацкіх вобразах героя Сталінскай эпохі, працоўнага чалавека, тварта матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей соцыялістычнага грамадства. Адначасова раскрыць ворага з усёй сілай, уласцівай народнаму мастаку, выказваючы да ворага нянавісць і пагарду. Дабіцца як мага больш шырокага ахопу маляўнічай і яркай сапраўднасці ў мастацкіх творах, — выкананне гэтай задачы магчыма толькі тады, калі совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў будуць арганічна звязаны з працоўнымі нашага Совецкага Саюза.

Наша партыя, народ, няўхільна ажыццяўляючы мудрыя ўказанні таварыша Сталіна, разграмілі заклятых ворагаў народа — трацкістаў, бухарынцаў, буржуазных нацыяналістаў, агентаў германа-польскага фашызма, імкнуўшыхся сарваць пабедапосны рух нашай краіны да комунізма.

Ярасная ў сваім бяссіллі злаба фашысцкай буржуазіі, рыхтуючай напад на Краіну соцыялізма і ў першую чаргу на яе фарпост на заходняй граніцы — БССР, разбіваецца аб несакрушальную магутнасць нашай соцыялістычнай дзяржавы. Перад тварам ваеннай небяспекі, нападу агрэсіўных фашысцкіх сіл наша вялікая радзіма, усведамляючы сваю магутнасць, прадаўжае мірна будаваць соцыялістычнае грамадства ў інтарэсах працоўных.

Дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР 25 ліпеня прыступяць да выканання сваіх ганаровых абавязкаў: будуць вырашаць важнейшыя пытанні соцыялістычнага будаўніцтва і абароназдольнасці нашай краіны. Яны прыступяць да работы, свята памятаючы вялікі сталінскі наказ дэпутатам:

«... Каб яны заставаліся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацяляў, каб яны заставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Гэты сталінскі наказ — праграма дзейнасці кожнага дэпутата. Вярхоўны Совет БССР узніме гэты ўсенародны наказ, як сцяг сваёй работы для шчасця народа.

Беларускі народ, падыходзячы да першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, ганарыцца такой выдатнейшай справай, як беспасадачны пералёт з Севастопаля ў Архангельск, у якім разам са сваімі гераічнымі падругамі тт. Осіпенка і Расковай удзельнічала і дачка беларускага народа, выхаванка большэвіцкай партыі Вера Фёдараўна Ламака.

Усе народы вялікага Совецкага Саюза захоплены рэкордным пералётам нашых герояў-лётчыкаў Кокінакі і Брандзінскага, якія сваім пералётам паднеслі краіне падарунак гераізма і адлюстравалі магутнасць соцыялістычнай радзімы.

Сустрэнем-жа адкрыццё першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР новымі перамогамі ва ўсіх галінах нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Няхай жыве правадыр народаў, тварэц Канстытуцыі перамогшага соцыялізма, арганізатар Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі — усенародны дэпутат вялікі Сталін!

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Рэгістрацыя прыбываючых на першую Сесію дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, выдача ўсіх даведак робіцца штодзённа з 9 гадзін раніцы да 12 гадзін ночы ў памяшканні ЦВК БССР (Дом урада, правае крыло, другі паверх, пакоі №№ 250 і 251. Тэлефоны: 22-349, 22-346 і 23-568).

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ ПЕРШАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР 1-га СКЛІКАННЯ 19 ліпеня 1938 года

19 ліпеня ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета РСФСР, у Крэмлі, адбылося чацвертае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета РСФСР 1-га склікання.

Старшынствуе — Старшыня Вярхоўнага Совета РСФСР дэпутат **Жданаў А. А.**

Вярхоўны Совет РСФСР прыступае да абмеркавання пункта 4-га парадку дня Сесіі — выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР.

Ад совета Старэйшын Вярхоўнага Совета РСФСР выступае з прапановай дэпутат **Сідараў І. І.**

Выклаўшы меркаванні, якія, па думцы совета Старэйшын, павінны быць пакладзены ў аснову выбрання Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР, дэпутат **Сідараў І. І.** агалашае кандыдатаў, вылучаемых советам Старэйшын у Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР. Персанальным галасаваннем кожнага кандыдата Вярхоўны Совет выбірае Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР у наступным складзе:

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

1. **Бадаеў Алексей Егоравіч,** дэпутат ад Усманскай акругі, Варонежская вобласць.

НАМЕСНІКІ СТАРШЫНІ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

2. **Дынмухаметаў Галей Афзалетдзінавіч,** дэпутат ад Кукморскай акругі, Татарская АССР.
3. **Ібрагімаў Рахім Кірэевіч,** дэпутат ад Мелеузаўскай акругі, Башкірская АССР.
4. **Цырэмпілон Доржы Цырэмпілавіч,** дэпутат ад Улан-Удэнскай акругі, Бурат-Мангольская АССР.
5. **Магамедаў Джамалутдзін Махмудавіч,** дэпутат ад Левашынскай акругі, Дагестанская АССР.
6. **Канкулаў Маша Герандукавіч,** дэпутат ад Окцябрскай акругі, Кабардзіна-Балкарская АССР.
7. **Пюрвееў Доржы Пюрвеевіч,** дэпутат ад Эліcцінскай акругі, Калмыцкая АССР.
8. **Гарбачоў Марк Васільевіч,** дэпутат ад Прыонежскай акругі, Карэльская АССР.
9. **Ветошкін Генадзій Васільевіч,** дэпутат ад Сыктыўкарскай акругі, Комі АССР.
10. **Менбарыеў Абдул Джэліль Хайрула,** дэпутат ад Джанкойскай акругі, Крымская АССР.
11. **Кавалераў Тімафей Ільіч,** дэпутат ад Горна-Марыйскай акругі, Марыйская АССР.
12. **Чэмбулатаў Міхаіл Андрэевіч,** дэпутат ад Томнікаўскай акругі, Мардоўская АССР.
13. **Гекман Александр Іоганесавіч,** дэпутат ад Бальцэрскай акругі, АССР Немцаў Паволж'я.
14. **Гаглоеў Георгій Давыдавіч,** дэпутат ад Алагірскай акругі, Паўночна-Осецінская АССР.
15. **Ардашэў Канстанцін Платонавіч,** дэпутат ад Воткінскай акругі, Удмурцкая АССР.
16. **Малаеў Сульян Кагіравіч,** дэпутат ад Урус-Мартанаўскай акругі, Чэчэна-Інгушская АССР.
17. **Андрэева Зоя Ананьеўна,** дэпутат ад Цывільскай акругі, Чувашская АССР.
18. **Амосаў Пётр Васільевіч,** дэпутат ад Алданскай акругі, Якуцкая АССР.

САКРАТАР ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

19. **Казлоў Георгій Васільевіч,** дэпутат ад Пяцігорскай акругі, Орджанікідзенскі край.

ЧЛЕНЫ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА РСФСР

20. **Андрэеў Андрэй Андрэевіч,** дэпутат ад Новасібірскай-Окцябрскай акругі, Новасібірская вобласць.
21. **Бахмураў Пётр Васільевіч,** дэпутат ад Камышлоўскай акругі, Чэлябінская вобласць.
22. **Власаў Іван Алексеевіч,** дэпутат ад Веневўскай акругі, Тульская вобласць.
23. **Данской Владзімір Александравіч,** дэпутат ад Пераслаўскай акругі, Яраслаўская вобласць.
24. **Ефрэмаў Александр Іларыёнавіч,** дэпутат ад Ульянаўскай акругі, г. Масква.
25. **Егораў Якаў Георгіевіч,** дэпутат ад Анжэра-Суджэнскай акругі, Новасібірская вобласць.
26. **Жураўлёў Нікалай Нікалаевіч,** дэпутат ад Карсунскай акругі, Куйбышэўская вобласць.
27. **Ігнацьеў Анатолій Іванавіч,** дэпутат ад Хвойнінскай акругі, Ленінградская вобласць.
28. **Казлоў Анатолій Петровіч,** дэпутат ад Курскай сельскай акругі, Курская вобласць.
29. **Казыркоў Іван Трафімавіч,** дэпутат ад Шэмышэйскай акругі, Тамбоўская вобласць.
30. **Косарэў Александр Васільевіч,** дэпутат ад Дзержынскай акругі, Горкаўская вобласць.
31. **Кузнецоў Нікалай Герасімавіч,** дэпутат ад Прыморскай акругі, Далёка-Усходні край.
32. **Папкоў Пётр Сергеевіч,** дэпутат ад Маскоўска-Ленінскай акругі, г. Ленінград.
33. **Седзін Іван Карнеевіч,** дэпутат ад Каменскай акругі, Тамбоўская вобласць.
34. **Стараторжскі Александр Паўлавіч,** дэпутат ад Балагоўскай акругі, Калінінская вобласць.
35. **Угараў Александр Іванавіч,** дэпутат ад Бауманскай акругі, г. Масква.
36. **Хахлоў Іван Сергеевіч,** дэпутат ад Мыцішчынскай акругі, Маскоўская вобласць.
37. **Шахурын Алексей Іванавіч,** дэпутат ад Галічскай акругі, Яраслаўская вобласць.
38. **Шкіратаў Мацвей Фёдаравіч,** дэпутат ад Тульскай сельскай акругі, Тульская вобласць.
39. **Якаўлеў Всевалад Фёдаравіч,** дэпутат ад Срэценскай акругі, Чыцінская вобласць.

Вярхоўны Совет РСФСР пераходзіць да разгляду 5-га пункта парадку дня — утварэнне ўрада РСФСР — Совета Народных Камісараў РСФСР.

Старшыня Вярхоўнага Совета РСФСР **Жданаў А. А.** агалашае наступную заяву Старшыні Совета Народных Камісараў РСФСР дэпутата **Булганіна Н. А.**

«Старшыні Вярхоўнага Совета РСФСР таварышу **Жданаву А. А.**

У адпаведнасці з артыкулам 47-м Канстытуцыі РСФСР і ў сувязі з тым, што ў парадак дня 1-й Сесіі Вярхоўнага Совета РСФСР пастаўлена на разгляд пытанне аб утварэнні Урада РСФСР, Совет Народных Камісараў РСФСР лічыць свае абавязкі вычарпанымі і складае свае поўнамоцтвы перад Вярхоўным Советам.

Совет Народных Камісараў РСФСР просіць Вас давесці аб гэтым да ведама Вярхоўнага Совета Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Старшыня Совета Народных Камісараў РСФСР — **Н. Булганін.**

19 ліпеня 1938 года».

Вярхоўны Совет пераходзіць да абмеркавання заявы Старшыні Совета Народных Камісараў РСФСР.

Выступіўшыя ў спрэчках дэпутаты **Угараў А. І.** (Бауманская акруга, гор. Масква), **Шкіратаў М. Ф.** (Тульская сельская акруга, Тульская вобласць), **Чэрваў І. М.** (Багатольская акруга, Краснаярскі край), **Кальцоў М. Е.** (Пензенская сельская акруга, Тамбоўская вобласць), **Косарэў А. В.** (Дзержынская акруга, Горкаўская вобласць) падвергді крытыцы дзейнасць асобных наркаматаў РСФСР (Народны Камісарыят Аховы Здароўя, Народны Камісарыят Асветы, Народны Камісарыят Мясцовай Прамысловасці, Народны Камісарыят Гандлю, Народны Камісарыят Земляробства, Народны Камісарыят Соўгасаў).

Па прапанове дэпутата **Хахлова І. С.** Вярхоўны Совет прымае наступную пастанову:

«Вярхоўны Совет Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі выказвае давер'е Совету Народных Камісараў Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі і даручае старшыні Совета Народных Камісараў Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі таварышу Булганіну Нікалаю Александравічу прадставіць прапановы аб складзе Урада, улічыўшы пры гэтым крытычныя заўвагі дэпутатаў, выказаныя ў ходзе спрэчак».

На гэтым чацвертае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета РСФСР закрываецца.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета РСФСР першага склікання 20 ліпеня 1938 года

20 ліпеня ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета РСФСР, у Крэмлі, адбылося пятае, заключнае пасяджэнне Першай Сесіі Вярхоўнага Совета РСФСР першага склікання.

Старшынствуе — Старшыня Вярхоўнага Совета РСФСР дэпутат **Жданаў А. А.**

Вярхоўны Совет прыступае да разгляду пытання аб фармаванні Совета Народных Камісараў РСФСР.

Дэпутат **Булганін Н. А.** уносіць на разгляд Вярхоўнага Совета склад Совета Народных Камісараў РСФСР.

Тав. Булганін у сваёй прамове адказвае на заўвагі і пытанні дэпутатаў, зробленыя на папярэднім пасяджэнні ў спрэчках па пытанню аб стварэнні Ўрада РСФСР.

Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет стварае наступны склад урада РСФСР — Совета Народных Камісараў РСФСР.

Старшыня Совета Народных Камісараў РСФСР — Нікалай Александравіч БУЛГАНІН.

Намеснік старшыні Совета Народных Камісараў РСФСР — Іван Грыгор'евіч КАБАНАЎ.

Старшыня Дзяржаўнай Планавай Камісіі — Якаў Ермалаевіч ЧАДАЕЎ.

Народны Камісар Харчовай Прамысловасці — Павел Васільевіч СМІРНОЎ.

Народны Камісар Лёгкай Прамысловасці — Сяргей Георгіевіч ЛУКІН.

Народны Камісар Лясной Прамысловасці — Трафім Паўлавіч КУДРАШОЎ.

Народны Камісар Земляробства — Павел Паўлавіч ЛАБАНАЎ.

Народны Камісар Зерневых і Жывёлагадоўчых Соўгасаў — Алексей Дзмітрыевіч СТУПАЎ.

Народны Камісар Фінансаў — Васілій Фёдаравіч ПАПОЎ.

Народны Камісар Гандлю — Александр Васільевіч ЛЮБІМАЎ.

Народны Камісар Юстыцыі — Якаў Петровіч ДЗМІТРЫЕЎ.

Народны Камісар Аховы Здароўя — Іван Іванавіч БЕЛАУСАЎ.

Народны Камісар Асветы — Пётр Андрэевіч ТЮРКІН.

Народны Камісар Мясцовай Прамысловасці — Васілій Васільевіч ВАХРУШОЎ.

Народны Камісар Комунальнай Гаспадаркі — Канстанцін Дзмітрыевіч ПАМФІЛАЎ.

Народны Камісар Соцыяльнага Забеспячэння — Марыя Александраўна ШАБУРАВА.

Начальнік Упраўлення па справах мастацтваў — Нікалай Нікалаевіч БЕСПАЛАЎ.

Начальнік Дарожнага Упраўлення — Всевалад Тіханавіч ФЕДАРАЎ.

На пасяджэнне Вярхоўнага Совета прыбываюць дэлегацыі ад рабочых, работніц, калгаснікаў, калгасніц, інтэлігенцыі і служачых, а таксама ад Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Ад імя дэлегацыі горада Масквы і Маскоўскай вобласці выступае рабочы-стаханавец завода № 1 імя Авіяхіма тав. **Фралоў А. А.**; ад дэлегацыі гор. Ленінграда — рабочы-стаханавец Кіраўскага завода тав. **Карташоў С. Г.**, ад дэлегацыі Татарскай АССР — майстар Казанскага ільнакамбіната тав. **Галіуліна А. Ф.**; ад дэлегацыі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — малодшы камандзір-артылерыст тав. **Кузнецоў Ф. В.** і малодшы камандзір-падводнік тав. **Коблікаў П. С.**

Парадак дня Сесіі вычарпан. Старшыня Вярхоўнага Совета РСФСР тав. Жданаў А. А. канстатуе, што па ўсіх пытаннях парадку дня Вярхоўным Советам прыняты аднадушныя рашэнні, і абвяшчае Першую Сесію Вярхоўнага Совета РСФСР закрытай.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ЭКІПАЖА САМАЛЁТА „МОСКВА“

За ажыццяўленне гераічнага беспасадачнага дальняга пералёту па маршруту Масква— Владзівасток і за праяўленыя пры гэтым выдатную мужнасць і майстэрства.

1. Прысвоіць званне Героя Совецкага Саюза і ўручыць ордэн Леніна, згодна „Палажэння аб званні Героя Совецкага Саюза“,

тав. **КОКІНАКІ Владзіміру Канстанцінавічу**—камандзіру экіпажа самалёта „Москва“

тав. **БРАНДЗІНСКАМУ Александру Матвеевічу**—штурману самалёта „Москва“.

2. Выдаць адначасовую грашовую ўзнагароду ўдзельнікам пералёту—т.т. **Кокінакі В. К.** і **Брандзінскаму А. М.** па 25 тысяч рублёў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА тт. ОСІПЕНКА П. Д. ЛАМАКА В. Ф. І РАСКОВАЙ М. М.

За паспяховае выкананне заданняў урада па беспасадачнаму пералёту Севастопаль—Архангельск на аднаматорным гідрасамалёце «МП-1» і за праяўленую пры гэтым доблесць узнагарадзіць ОРДЭНАМ ЛЕНІНА старшага лейтэнанта Паліну Дзянісаўну Осіпенка, старшага лейтэнанта Веру Фёдараўну Ламака і штурмана-лейтэнанта Марыну Міхайлаўну Раскову.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
15 ліпеня 1938 года.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА тав. ШВЕРНІКА Н. М.

У сувязі з споўніўшымся 50-годдзем тав. Нікалая Міхайлавіча Шверніка, першага сакратара ВЦСПС, і прымаючы пад увагу яго выдатныя заслугі перад рабочым класам, узнагарадзіць таварыша Шверніка Н. М. *ордэнам Леніна.*

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
15 ліпеня 1938 года.

12 год з дня смерці Ф. Э. Дзержынскага



Ф. Э. ДЗЕРЖЫНСКІ ў 1917 годзе

Жыццё яго—узор для нас

20 ліпеня 1926 года памёр непахісны і верны сын комуністычнай партыі большэвікоў, саратнік Леніна і Сталіна—Фелікс Эдмундавіч Дзержынскі.

Ніколі народы вялікай совецкай радзімы не забудуць палкага барацьбіта з вялікім сэрцам, у якім гарэў незгасальны агонь нянавісці да ворагаў рэволюцыі, якое было поўна любві да працоўных, да прыгнечанага капіталізмам чалавецтва.

Азвярэлая контррэволюцыя ашчацінілася, сочыць з-за кожнага вугла, згуртоўвае вакол сябе ўсю нечысць і погань, каб з гэтай бандай чалавечага атрэп'я задушыць, утапіць у крыві маладую соцыялістычную рэспубліку. У гэтыя трывожныя дні і ночы Фелікс Эдмундавіч не спаў па некалькі сутак, не адыходзячы ад тэлефонаў, аддаючы распараджэнні, падпісваючы рашэнні.

Хіба можа спаць большэвік, калі радзіма ў небяспецы? Хіба можа спаць чэкіст, старшыня ВЧК, калі вуліцы кішаць шпіёнамі, правакатарамі, бандытамі? Гэтыя мярзаўцы падсцерагалі правадыроў і кіраўнікоў партыі і рэволюцыі, каб з-за вугла ўсадзіць ім нож у спіну. Хіба мог спаць Фелікс Эдмундавіч?

Хіба можна забыць адну, мабыць, мільённую кропельку ўсёй любві Дзержынскага да таварыша Леніна, паказаную ў кінофільме «Ленін у Кастрычніку», дзе таварыш Дзержынскі скідвае з сябе плашч і аддае яго Леніну?

Рэволюцыйная патрабавальнасць, дысцыпліна, пільнасць, непрымірымасць да ворагаў народа і рэволюцыі — вось асноўныя рысы характару таварыша Дзержынскага. Туды, дзе неабходна было тэрмінова ліквідаваць прарыў, туды, дзе патрэбна было прыняць надзвычайныя меры, пасылаўся Фелікс Эдмундавіч.

Прайшоўшы праз усе этапы катаргі і ссылак, пачэрпнуўшы вялікі жыццёвы вопыт, Фелікс Дзержынскі ўмеў угадваць паміж людзей захаваўшагася ворага. Улаўліваючы самыя маленькія сігналы, ён умеў знаходзіць небяспеку, умеў накіраваць па ёй удар і ліквідаваць яе.

Імклівасць і трапнасць удару па ворагу — характэрныя рысы барацьбы Дзержынскага з небяспекай, пагражаўшай справе рэволюцыі.

...Грамадзянская вайна скончана. Маладая совецкая радзіма пераходзіць да гаспадарчага будаўніцтва. Важнейшым участкам гэтага будаўніцтва з'яўляецца чыгуначны транспарт, які за часы імперыялістычнай і грамадзянскай вайны прышоў амаль у нягоднасць. Атрэп'е контррэволюцыйнага чыноўніцтва засела на транспарце і наўмысна эрывала яго работу.

Жыццё разбуранай войнамі радзімы залежала ад хутчэйшага аднаўлення прамысловасці, таваразвароту і сельскай гаспадаркі. Ленін указваў, што калі гэтага не будзе, дык заваёвам Кастрычніка прыдзе крах.

І вось на гэты ўчастак партыя і ўрад накіроўваюць Фелікса Эдмундавіча.

Жалезнай чэкісцкай мятлой вымеў тав. Дзержынскі ўсю нечысць і погань, забруджваўшую соцыялістычны транспарт, з умельствам вопытнага кіраўніка і арганізатара павёў ён за сабой масы рабочых і служачых на барацьбу з прарывам і транспарт пачаў жыць і дыхаць соцыялістычнымі тэмпамі, стаў выконваць ускладаемыя на яго задачы.

Але транспартам не вырашалася задача перамогі соцыялізма. Прамысловасць патрабавала неадкладнага аднаўлення і рэканструкцыі. Ля руля ўпраўлення соцыялістычнай прамысловасцю—ВСНГ—быў пастаўлен таварыш Дзержынскі.

Працуючы на гэтых адказнейшых участках, Фелікс Эдмундавіч не пакідаў сваёй работы ў ЧК і не адзін сакрушальны ўдар своечасова і трапна нанесён ворагам рэволюцыі.

Жыццё Фелікса Эдмундавіча Дзержынскага—яркі ўзор для верных сыноў нашай соцыялістычнай радзімы.

25 ЛІПЕНЯ АДКРЫВАЕЦЦА ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ДЭПУТАТАМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Дарагія таварышы дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР!

У дзень адкрыцця першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР мне хочацца выказаць набалеўшыя пытанні ў галіне выяўленчага мастацтва БССР, з тым, каб вярхоўны орган народнай улады дапамог нам вырашыць усе гэтыя пытанні, знішчыў перашкоды, якія стаяць на шляху развіцця беларускага мастацтва.

За годы існавання БССР вырас значны кадр кваліфікаваных беларускіх мастакоў-жывапісцаў, скульптараў, графікаў, афарміцеляў, якія стварылі рад каштоўных мастацкіх твораў і афармілі з дапамогай рускіх мастакоў лепшыя архітэктурныя пабудовы БССР—Дом урада, Палац піянераў, Дом Чырвонай Арміі.

Але поспехі мастакоў Совецкай Беларусі былі-б значна большымі, каб не падрыўная работа ворагаў народа, якія прабраліся на фронт выяўленчага мастацтва і нанеслі яму вялікую шкоду.

Шкоднікі развальвалі Саюз совецкіх мастакоў БССР і імкнуліся сарваць усю творчую работу, адарваць мастакоў ад шырокіх грамадскіх колаў, пасеяць разлад паміж мастакамі, перашкаджалі сувязі мастакоў з народнай творчасцю. Ворагі ўсякім чынам імкнуліся дыскрэдытыраваць работу кваліфікаваных беларускіх мастакоў, якія працавалі над рэволюцыйнай тэматыкай і над стварэннем вобразаў вялікіх правадыроў працоўных.

Імкнучыся сарваць работу старэйшых мастакоў над вялікімі адказнымі тэмамі, ворагі адначасова правакацыйна штурхалі маладых мастакоў, адрываючы іх ад вучобы, на выкананне работ такога вялікага аб'ёму, з якім яны яшчэ не маглі справіцца.

Думаю, што невыпадкова таксама не было створана належных умоў для работы мастакоў БССР. Майстэрні мастакоў пабудаваны так, што зімою ў іх нельга працаваць. Ніколі Упраўленне па справах мастацтваў не клапацілася аб бытавых умовах мастакоў.

Дрэнна ў нас абстаіць справа з падрыхтоўкай кваліфікаваных кадраў мастакоў. Да гэтага часу адзінае вучылішча выяўленчага мастацтва БССР не ўкамплектавана ў дастатковай меры высокакваліфікаванымі педагогамі, вучылішча выпускае недастаткова кваліфікаваных людзей.

Поўнасцю адсутнічае крытыка твораў мастакоў, нічога не робіць у гэтай галіне Інстытут літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. Выхаваўчая работа ў асяроддзі мастакоў адсутнічала ўвесь час. Пагэтаму ў многіх мастакоў ідэйна-палітычны ўзровень вельмі нізкі. Людзі амаль нічога не чытаюць, а некаторыя з мастакоў ператвараюцца ў вузкіх рамеснікаў сваёй справы.

Для таго, каб усё гэта выкарчаваць, нам неабходна ў першую чаргу стварыць моцны мастацкі цэнтр — Саюз совецкіх мастакоў БССР, у які ўвайшлі-б усе кваліфікаваныя сілы беларускіх мастакоў.

Неабходна арганізаваць штодзённую сувязь і абмен вопытам з мастакамі братніх рэспублік.

Патрэбна пабудаваць майстэрні для мастакоў, а таксама выставачныя памяшканні, дзе-б можна было штогод наладжваць выстаўкі. Гэта будзе спрыяць наладжванню штодзённай сувязі мастакоў з шырокімі масамі совецкага народа.


Час ужо арганізаваць сувязь мастакоў праз Упраўленне па справах мастацтваў з будаўнічымі і архітэктурнымі арганізацыямі з тою мэтаю, каб мастацкае афармленне гарадоў, будынкаў, грамадскіх выставак і інш. у БССР праходзіла пры актыўным удзеле беларускіх мастакоў.

Беларускім мастакам, неабходна даць магчымасць удзельнічаць у дэкадзе беларускага мастацтва, якая адбудзецца ў Маскве ў 1939 годзе, даўшы ім афарміць спектаклі тэатраў—опернага і драматычнага. У часе дэкады трэба арганізаваць выстаўку беларускага выяўленчага мастацтва ў Маскве.

Мастакі Совецкай Беларусі павінны наладзіць шчыльную сувязь з шырокімі масамі совецкага народа, а таксама наладзіць сувязь з работнікамі іншых мастацтваў—літаратуры, тэатра, музыкі, народнай творчасці.

Мы, мастакі, павінны быць пільнымі байцамі пагранічнай рэспублікі, патрыётамі совецкага народа. Каб стаць такімі мастакамі, трэба ўзняць свой ідэйна-культурны ўзровень. Толькі тады мы зможам выканаць тыя вялікія гістарычныя задачы, якія ўскладзены на совецкае мастацтва нашай любімай соцыялістычнай радзімай.

Скульптар Заір АЗГУР.



Вуліца 9 студзеня ў Баку (Азербайджанская ССР).

ЯНКА КУПАЛА

***

Час быў тады, калі ў поле
Плуг не выходзіў іржавы,
Хаты паліў на вуголле
Вораг — прыблуда з Варшавы

Сейбіт не йшоў працавіты
Зернем абсеяць палетак...
Вытаптаў вораг і жыта,
Што сеяў сейбіт для дзетак.

Людзі, век ліўшы кроў з потам,
Гэткіх не зналі падзеяў...
Вылі сабакі за плотам,
Клікалі смерць ліхадзеям.

Дрогнулі пушчы, курганы
Супроць магнацкай навалы, —
Лесам пашлі партызаны,
Помста на ворага ўстала.

А з-пад Масквы з-пад чырвонай
Войска ішло ўжо за войскам

Браць пад сваю абарону
Нашыя месты і вёскі.

І людзі выцерлі слёзы,
Раны свае загаілі.
Панскай не страх ім пагрозы,
Вораг больш іх не асіліць.

Сёння народ ачунялы
Стаўся заможны, багаты,
Сёння ён смела і дбала
Сее, збірае зерняты.

Вечнай не мучыцца смагай,
Сонца ясней яму свеціць,
Стаўся пад сталінскім сцягам
Знатным народам на свеце.

Радасць, як хваля на рэчцы.
Радасць плыве маладая.
Сталіну людзі ўсім сэрцам
Песні і думы складаюць.

Міхась Калачынскі

КАЛГАСНАЯ ВЕЧАРЫНКА

Ужо хлопцы агні за сялом
Раскладаюць ля самага гаю,
Будзіць цемрадзь начную святло
І людзей да сябе сабірае.

Выхадзі, гарманіст, выхадзі,
Весялун малады наш, чаканы.
Паглядзі, гарманіст, паглядзі —
Поўсяла йдзе на голас баяна.

За табой, як за маткаю рой,
Выступаюць хлапцы і дзяўчаты;
Азірніся — ідуць за табой
І бабуля, і дзед барадаты.

Заіграй, гарманіст, заіграй,
Каб у песнях гаі патанулі.
Пачынайце гульню. Пачынай
Ты, старэйшая ў вёсцы бабуля.

І бярэцца за фартух
Старая жанчына:
— Шырай круг, шырай круг! —
Патрабуе чынна.

Як прытупне каблуком
Ды па росным доле, —
Адгукаецца кругом
Звонкі гай і поле:

— Сорак лет і сорак зім
Не плясала я зусім;
Нарадзілася ў бядзе,

Узрасла на лебядзе.
А цяпер мне не бяда —
Пайшла к чорту лебеда.

Сорак лет і сорак зім
Не плясала-ж я зусім.
Маю семера дзяцей,
Ды скачу я весялей.

Не ўстрымаўся і дзядок
З доўгай барадою,
Падчапіўшы рукі ў бок,
Скача ўслед за ёю:

— Эх, лапці мае,
З лазовага лыка,
Каб вас чорт насіў,
Памінала ліха!

Эх, лапці мае,
Лапцейкі ліповыя
Я навекі пахаваў —
Нашу боты новыя;
Нашу боты новыя,
Новыя, шаўровыя.

... І лятуць у вузкі круг
Хлопцы і дзяўчаты...
. . . .
На палі ідзе, на луг
Золак сіняваты.

Калгас імя Комінтэрна,
Крупскі раён.

СТВОРЫМ ПАДРУЧНІК ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Інстытутам літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР разгорнута работа па напісанню падручніка па гісторыі беларускай літаратуры для вышэйшых навучальных устаноў. Уся секцыя літаратуры пераключана на выкананне гэтай тэмы. Для ўдзелу ў рабоце прыцягнуты некаторыя супрацоўнікі Менскага і Магілеўскага педінстытутаў. Рад раздзелаў падручніка ўжо напісан работнікамі Інстытута літаратуры і мовы, распрацаван агульны план яго і рабочыя праграмы па раду тэм. Адказным за работу вылучан кандыдат навук тав. Барысенка.

У рабоце па складанню падручніка павінен прымаць удзел і Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР. Паводле пастановы праўлення ССПБ пісьменнікі тт. Крапіва, Бядуля, Глебка, Чорны, Лынькоў, крытыкі тт. Клімковіч, Шарахоўскі, Кучар павінны будуць прымаць удзел у складанні падручніка. Праўленне саюза абавязалася забяспечыць удзел названых таварышоў — пісьменнікаў і крытыкаў—у складанні падручніка.

Аднак, відавочна не ўсе яшчэ, каму гэта трэба, зразумелі важнасць пастаўленай задачы.

Напісанне падручніка па гісторыі беларускай літаратуры — важнейшае заданне партыі і ўрада. Падручнік павінен даць сапраўдную гістарычную карціну развіцця беларускай літаратуры, карціну развіцця духоўных каштоўнасцей нашага беларускага народа. Падручнік павінен паказаць тую непрымірымую барацьбу, якую вёў беларускі народ з эксплаататарамі, са сваімі злейшымі ворагамі—польскімі панамі на працягу доўгіх вякоў на ўсіх участках сваёй культуры, у тым ліку і на ўчастку літаратуры.

У падручніку павінны знайсці адлюстраванне тыя змрочныя часы феадалізма, калі беларускі народ знаходзіўся пад ярмом палякаў і літоўцаў. У гэты перыяд, названы агентурай польскага фашызма — нацыянал-фашыстамі «залатым векам» гісторыі Беларусі, беларускі народ, як ніколі, цярпеў цяжкі гнёт. Свой магутны пратэст, сваё імкненне вызваліцца з-пад ярма прыгнятальнікаў беларускі народ адлюстроўваў у сваёй творчасці — у фальклоры, у творчасці сваіх сыноў—пісьменнікаў.

Праз усю гісторыю беларускай літаратуры ад старажытных часоў і аж да сёнешняга дня чырвонай істужкай праходзіць імкненне беларускага народа да саюза з родным яму рускім народам, да рускай культуры.

Уся гэта гістарычная сапраўднасць, пакрытая вельмі часта плесенню варожых «тэорый» і «тэорыяк», старанна пладзіўшыхся польскімі лазутчыкамі, што апраналіся ў тогу вучоных павінна быць расчышчана ад усяго наноснага і ярка і пераканаўча паказана ў падручніку.

Падручнік па гісторыі беларускай літаратуры — насушча патрэбная для настаўнікаў, студэнтаў і вучняў кніга. Яе чакаюць з нецярпеннем.

Таму трэба толькі дзівіцца, што некаторыя крытыкі і літаратурныя работнікі лічаць сябе нічым не абавязанымі ў гэтым напрамку і праяўляюць здзіўляючую роўнадушнасць і спакой, ставячы сябе ў баку ад гэтай важнейшай палітычнай задачы. Такім, напрыклад, інертным чыноўнікам ад крытыкі аказаўся тав. Карабан, які ўпарта заяўляе, што, маўляў, «нічога ў вас не выйдзе», «адчапіцеся»!

Здзіўляе роўнадушнасць і спакой пісьменніцкай арганізацыі. Праўленне саюза пісьменнікаў абмеркавала пытанне, вынесла рашэнне і паклала яго (як, мабыць, і не толькі яго) пад сукно.

Узнікае пытанне — ці не магло-б гэта пытанне стаць прадметам абгаварэння ў партарганізацыі ССПБ?

Трэба зразумець, што сярод усёй работы саюза пісьменнікаў зараз гэта, бадай, ці не адна з важнейшых.

К. ГУРСКІ.

АБ ПАДРУЧНІКУ ПА ЛІТАРАТУРЫ

Комуністычная партыя і совецкі ўрад надаюць літаратурнай асвеце грамадзян нашай радзімы не менш важнае значэнне, чым асвеце гістарычнай. З'яўляючыся багацейшай скарбніцай агульна-чалавечай духоўнай культуры, літаратура мае выключнае пазнаваўчае і выхаваўчае значэнне. І аднолькава важна ведаць і сусветную літаратуру, і літаратуру братніх народаў, і літаратуру свайго народа. Але, каб належна асвоіць усе багацці, створаныя духоўным геніем народа, патрэбны папулярныя падручнікі. Стварэнню такіх падручнікаў шмат увагі ўдзяляе ЦК ВКП(б) і асабіста таварыш Сталін.

XVII з'езд КП(б)Б у сваіх рашэннях запісаў аб неабходнасці «практычна паставіць і вырашыць пытанні далейшага развіцця беларускай мовы, ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў галіне мовы і выкладання літаратуры».

Ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў галіне мовы і выкладання літаратуры—гэта значыць ліквідаваць усе варожыя і шкодніцкія ўстаноўкі ў мовазнаўчай і літаратуразнаўчай галінах нашай культуры, адначасова распрацаваўшы новыя, большэвіцкія ўстаноўкі. І яшчэ важней распрацаваць новыя падручнікі па адпаведных пытаннях, у прыватнасці падручнікі па гісторыі беларускай літаратуры.

Падручнікі па гэтаму пытанню, як і падручнікі па гісторыі беларускага народа, доўгі час былі тым участкам ідэалагічнага фронта, на якім падвізаліся ворагі ўсіх масцей, пачынаючы з чорнасоценных вялікадзяржаўніцкіх шавіністаў і канчаючы буржуазнымі нацыяналістамі, шпіёнамі і дыверсантамі фашысцкіх разведак.

У выніку мы да гэтага часу не маем не толькі сістэматычнага курса беларускай літаратуры, а нават паасобных нарысаў і матэрыялаў да яго. Горш таго, — мы не маем нават здавальняючых хрэстаматый і чытанак па беларускай літаратуры, асабліва за дарэволюцыйны час.

Патрэба-ж у падручніку па літаратуры ўзрастае тым больш, што за апошні час заўважаецца безліч фактаў няправільнага, антымарксісцкага падыходу да твораў паасобных пісьменнікаў і да саміх пісьменнікаў з боку выкладчыкаў літаратуры. Матэрыялы, якія друкаваліся ў нашай газеце пра выкладанне беларускай літаратуры ў Менскім педагагічным інстытуце, — яркае сведчанне таму. Не падлягае сумненню, што і ў іншых навучальных установах рэспублікі ў справе выкладання беларускай літаратуры не лепш.

Ворагі беларускага народа, трацкісты і бухарынцы, польскія і нямецкія шпіёны рабілі ўсё магчымае, каб прывіць нашаму падрастаючаму пакаленню патрэбныя ім у іх падрыўных мэтах погляды на гісторыю нашага народа і на яго культуру. Таму ў асвятленні пытанняў гісторыі беларускай літаратуры бытуе яшчэ шмат варожага, дыверсійнага, заведама ілжывага.

Многія варожыя ўстаноўкі і шкодныя фармуліроўкі бытуюць па гэты дзень у выкладанні літаратуры ў вышэйшых навучальных установах, а праз іх распаўсюджваюцца і на масавую школу. Выкладчыкі беларускай літаратуры ў сярэдніх і няпоўных сярэдніх школах на перыферыі, з-за непаваротлівасці органаў Наркамасветы, часта бываюць зусім дэзарганізаваны ў пытаннях сваёй работы, адмаўляюцца выкладаць прадмет. Такія факты былі ў мінулым навучальным годзе.

Ясна, што гэтага не было-б, калі-б у нас быў стабільны падручнік па літаратуры. Такі падручнік зараз складаецца. Складае яго брыгада работнікаў Інстытута літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР.

На працягу многіх стагоддзяў змагаўся беларускі народ за сваё нацыянальнае і соцыяльнае вызваленне. Гісторыя беларускага народа — гэта гісторыя барацьбы супроць парабашчэння яго літоўскімі князямі, польскімі панамі, рускімі памешчыкамі і капіталістамі. Гэта гісторыя багата фактамі гераічнай барацьбы нашага народа за адваяванне права на сваю дзяржаўнасць, на развіццё сваёй культуры і мовы. Колькі помнікаў гэтай барацьбы захавана ў скарбніцах вуснай слоўнай творчасці нашага народа, у яго песнях, легендах і казках! Сабраць усё гэта, ачысціць ад рэакцыйнага смецця, ад падробак розных сумніцельных «збіральнікаў» і варожых стылізатараў — і прад намі зазіхацяць няўміручыя пэрлы народнай мудрасці, адкрыецца праўда народная, вера нашага народа ў сваю лепшую будучыню, якая не пакідала яго ніколі нават у самыя змрочныя часы яго гісторыі.

Навуковая распрацоўка старажытняга беларускага фальклору і іншых літаратурных помнікаў XVII—XVIII стагоддзяў, сабраных у шматлікіх выданнях і раскіданых па розных сховішчах,— адна з важнейшых і адказных задач, якая стаіць перад складальнікамі падручніка па беларускай літаратуры. Можна сказаць, што паспяховае вырашэнне гэтай задачы прадвырашыць лёс усяго падручніка.

Другой, не менш важнай, задачай з'яўляецца правільнае высвятленне пытання аб сувязі паміж беларускай культурай і культурамі братніх рускага і украінскага народаў, а адсюль — і паміж іх літаратурамі. Родны па гістарычнаму паходжанню, эканамічнаму жыццю, па культуры і мове з рускім народам, наш народ увесь час сваёй гісторыі цягнуўся да Расіі, разам з украінскім народам імкнуўся да яе, змагаючыся за сваё вызваленне з-пад іга польскіх і літоўскіх магнатаў. Рускі народ, яго рабочы клас з комуністычнай партыяй начале дапамог беларускаму народу заваяваць сваю дзяржаўнасць, стварыць сваю свабодную дзяржаву — БССР. Гэтай дапамогі беларускі народ ніколі не забудзе і тым больш умацоўваецца яго дружба з рускім народам, чым больш выразна праяўляюць польскія паны свае імкненні да захопу Совецкай Беларусі.

У беларускай літаратуры XVIII—XIX стагоддзяў — і вуснай і пісьмовай — яскрава адлюстравана барацьба беларускага народа і супроць расійскага самаўладства і супроць сваіх і польскіх паноў і падпанкаў. Але нідзе не гаворыцца ў творчасці беларускага народа аб яго варожасці да народа рускага — такія «творы» стварыліся паганымі рукамі буржуазных нацыяналістаў, але пану ім даў сам наш народ, выкінуўшы іх разам з іх аўтарамі за борт гісторыі.

Вось гэта другое, што павінна быць чотка і акрэслена паказана ў падручніку па гісторыі беларускай літаратуры.

І, нарэшце, трэцяя задача, якая стаіць перад складальнікамі падручніка, — правільная ацэнка літаратурнага руху на Беларусі ў паслякастрычніцкі час. Гэта, бадай, найбольш лёгкая, але разам з тым і складаная задача. Падручнік павінен ярка адлюстраваць той магутны росквіт духоўнай культуры нашага народа, які з'явіўся ў выніку соцыялістычнай рэволюцыі, у братнім супрацоўніцтве нашага народа з вялікім рускім народам. Трэба ярка адлюстраваць, як беларускі народ у сваёй і пісьмовай і вуснай літаратуры ўвасобіў вялікія перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі партыі большэвікоў, расказаць пра творы аб дружбе народаў, насяляючых СССР, аб вялікай любві нашага народа да гераічнага рускага народа, да комуністычнай партыі, да геніяў пролетарскай рэволюцыі—правадыроў народа Леніна і Сталіна. Твораў аб гэтым шмат і ўсё лепшае павінна быць адзначана ў падручніку.

Папулярнасць выкладання, сцісласць, палітычная завостранасць і гістарычная граматнасць — вось што павінна характарызаваць падручнік. Разам з тым гэта павінна быць кніга аб гісторыі літаратуры, а не падручнік па агульнай гісторыі, гэта павінна быць кніга, якая па-мастацку расказвае аб мастацкай творчасці нашага народа.

Але ці можа Інстытут літаратуры і мовы адзін справіцца з гэтай задачай? Ці дастаткова кваліфікаваныя яго кадры, каб даць нам стабільны падручнік па літаратуры высокай якасці?

Інстытут літаратуры і мовы не раз ужо даводзіў сваю неадпаведнасць тым задачам, вырашаць якія ён заклікан, і той ролі, якую павінен адыгрываць ён у развіцці нашай соцыялістычнай культуры. Яркі прыклад гэтага — работа Інстытута па складанню слоўніка беларускай мовы. Выданы ў 1937 годзе пасля амаль шасцігадовай падрыхтоўчай работы «Руска-беларускі слоўнік» аказаўся плодам антынавуковага, антымарксісцкага падыходу да пытанняў і з'яў мовы, рэзультатам безадказных адносін да вывучэння жывой мовы народа, сведчаннем мовазнаўчай некампетэнтнасці яго складальнікаў. Скажам проста: слоўнік гэты — дрэнна замаскіраванае перавыданне, копія бачыўшых ужо свет «практычных» руска-беларускіх слоўнікаў.

Ні адно са змешчаных у слоўніку 1937 года слоў Інстытут літаратуры і мовы не можа пацвердзіць дакументамі ўласнай, самастойнай яго апрацоўкі (запіс, вывучэнне, рэгістрацыя). Гэта факт, аб якім, чырванеючы ад позняга сораму, гаварылі работнікі Інстытута на нарадзе пры Акадэміі ўвосені мінулага года. Рэдагаваў слоўнік невук, шарлатан, гэтак-жа далёкі ад навукі, як неба ад зямлі, мацёры двурушнік, толькі нядаўна выкрыты органамі НКВД як закляты вораг беларускага народа, як стаўленік шпіёнаў і дыверсантаў на літаратурным фронце БССР.

Ясна пасля гэтага, што павышэнне палітычнай пільнасці і навуковай кампетэнтнасці работнікаў Інстытута літаратуры і мовы — надзвычай неабходная ўмова стварэння падручніка па гісторыі беларускай літаратуры.

Правільна ставіць у друкуемым намі сёння артыкуле тав. К. Гурскі пытанне аб тым, што стварэнне падручніка — справа не аднаго толькі Інстытута літаратуры і мовы. Справа гэта дзяржаўнага значэння, якая патрабуе практычнага і дзейснага ўдзелу ў ёй усёй навукова-літаратурнай грамадскасці БССР, партыйных арганізацый Акадэміі навук і Саюза пісьменнікаў у першую чаргу. Партыйная арганізацыя Саюза пісьменнікаў, у прыватнасці, нічога яшчэ не зрабіла для гэтай справы.

Справа па складанню падручніка па літаратуры толькі распачата і на выкананне яе патрэбен неабходны час. Але і зацягваць справу нельга. Тысячы тысяч падрастаючых грамадзян нашай радзімы чакаюць гэтага падручніка і яго трэба даць ім як мага хутчэй.

ДВУХГОДДЗЕ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ІСПАНСКАГА НАРОДА СУПРОЦЬ ФАШЫСЦКІХ ІНТЭРВЕНТАЎ

З ІСПАНСКАГА ДЗЁННІКА

9 ЧЭРВЕНЯ.

Гідэз вырашыў ляцець у поўдзень, а Янгуас — у шэсць вечара. Я сказаў Абелю, што калі да поўдня не паспею прыехаць на пляж, няхай ляцяць без мяне, — увечары, у отэлі Лафайет у Тулузе мы сустрэнемся. Ен узяў мой багаж.

З баявых участкаў удалося вярнуцца толькі ў тры.

Калі ў пяць гадзін мы з Янгуасам, з Карменам і з іншымі пражываючымі прыехалі ў Ларэдо, мы застылі пры ўбачанні таго, што адкрылася нашым вачам.

На беразе стаяў і глядзеў уперад нерухомы, толькі вельмі ўскудлачаны Гідэз. Побач з ім валяўся, увесь размоклы, мой белы чамадан з адным абламаным замком.

У моры, за поўкілометра прыкладна, напалову тырчаў з вады самалёт Гідэза. Адзін матор абламаўся і вісеў на якойсьці трубе, як вока, вырванае з арбіты. Адна нага з колам таксама была падламана. Да трупа самалёта быў прышвартован рыбачы баркас.

— Што здарылася, Абель?!

Ен расказаў, паволі, з паўзамі, як дзіцё са сну: прыехаў, загрузіў машыну, пасадзіў пасажыраў, не дачакаўся мяне, завёў маторы, яны працавалі выдатна, доўга выпрабоўваць не стаў, каб не разаграваць і не траціць гаручае, узляцеў, узляцеў добра, вышаў на курс, стаў адыходзіць ад берага, і тут раптам здохлі адразу абодва маторы. Адразу, і ў адзін і той-жа момант. Гэта-ж ніколі не здараецца, ці не так? Абодва разам, і ў адзін і той-жа час. Самалёт стаў падаць, ён з велізарнымі цяжкасцямі крыху спланіраваў, паслабіў удар. Усе апынуліся ў вадзе, выбраліся з кабіны, машына якімсьці цудам напоўтрымалася на хвалях. Людзі ўцалелі таму, што падзенне самалёта было відаць з берага, рыбакі паспяшалі ратаваць. Яшчэ дзве хвіліны, і самалёт загінуў-бы ў адзіноце.

— Што-ж здарылася з маторамі? Якая сволач корпалася ў іх?

— Я не ведаю, — адказаў Гідэз: — машыну ахоўвалі нейкія тутэйшыя людзі, тыя-ж, што ахоўваюць машыну Янгуаса. Трэба расследваць. Трэба выцягнуць машыну на бераг і абследаваць маторы.

— Цукар, — сказаў Янгуас.

— Які цукар?

— Яны насыпалі ў бензін цукру.

— А вы адкуль ведаеце?

— Я не ведаю, а разумею. Яны насыпалі ў бензін цукру, гэта падзейнічала не адразу, а праз некалькі хвілін работы матораў, калі закупорылася падача. Гэта стары трук.

— А ў вас у маторах цукру не акажацца?

— Не акажацца. У мяне механік начаваў у кабіне.

Гідэз і Кармен прыедуць параходам «Гаванна», на якім адпраўляюць новую партыю баскскіх дзяцей. Гідэз стаіць усё яшчэ разгублены і спалоханы.

— Я даб'юся самага дасканалага расследвання. Я ім давяду!

Яму здаецца, што зганьбавана яго пілоцкая кваліфікацыя. Ен вырашыў, што падвялі мяне, які рэкамендаваў яго.

— Не хвалюйся. Не аб табе ідзе гутарка. Справа ясная Прыязджай хутчэй, дастань другую машыну і лётай далей.

— Цяпер я ўжо буду лётаць. Я ім пакажу!

— Лепш-бы і вам дачакацца «Гаванны», — раптам звярнуўся да мяне праводзіўшы Базіліо.

Мяне і самога пацягнула на «Гаванну»... Але Янгуас ужо сядзеў за штурвалам, вінты шумелі. Я заняў сваё месца побач.

Зноў гэта Біскайскае мора; у чацверты раз, будзь яно праклята. Але цяпер усё ішло, як па рэйках. Правы матор амаль не барахліў. Паказаўся ўнізе вялікі ваенны крэйсер. «Балеарэс» — кінуў на яго Янгуас.

Французскі бераг цяпер быў гасцінны. Мора агнёў і каляровыя маякі Тулузы сустрэлі нас. Тут-жа, у аэрапорце, заказаў сабе на раніцу месца на Барселону.

10 ЧЭРВЕНЯ.

Вялікі карабель таварыства «Эр Франс» лёгка і плаўна адчаліў ад зялёнай гладзі аэрадрома. Чатыры магутных маторы гудзелі глуха і спакойна; у прасторнай кабіне, на шырокіх крэслах, ля велізарных вакон сядзелася ціха, дрымотна. На століках валяліся стракатыя праспекты і путэвадзіцелі, гэта лінія Тулуза — Алікантэ — Танжэр — Рабат. Пілот раўнадушна глядзеў уперад, побач з ім борт-механік чытаў газету. Я ўспомніў, як Мігэль Марцінес перабіраўся ў Барселону па падобнаму маршруту. І «Мир приключений» паміж Байонай і Більбао... Цяпер гэта быў толькі звычайны маленькі перагон саліднага паветранага экспрэса.

Барселона дыхнула цяжкай спёкай. Усе пахаваліся з вуліц у цень. Заказаў сабе машыну на Валенсію. У «Маджэстыку» я знайшоў Эрэнбурга, ён пакутваў ад духаты, ён сказаў мне, што ўчора пачалося рэспубліканскае наступленне на Уэску. ударнай групай у гэтай аперацыі служыць сорак пятая дывізія, пад камандай Лукача-Залкі. Вестак з фронта яшчэ няма.

Мы вырашылі паснедаць разам, ён выйшаў кудысьці па суседству і адразу-ж вярнуўся. На ім не было твару.

— Звоняць па тэлефону, — сказаў ён. — Быццам-бы Лукач забіт.

— Хто звоніць?

— З Лерыды. Быццам Лукач і Рэглер забіты разам, у аўтамабілі. Ці то снарадам, ці то бомбай з самалёта.

Я выдавіў з сябе:

— Гэта, напэўна, вутка. Тут-жа любяць выдумляць, што каму прыдзе ў галаву.

Але мы не пайшлі снедаць. Машына на Валенсію таксама забавілася. Па тэлефону з розных канцоў перадавалі розныя чуткі і варыянты, але ўсе мала абнадзейваючыя. З Лукачом і Рэглерам, бясспрэчна, штосьці здарылася. Па аднаму варыянту, Лукач загінуў, а Рэглер цяжка паранен. Па другому — абодва паранены. Па трэцяму — загінула трое: Лукач, Рэглер і Гейльбрун, начальнік санчасці ў Лукача. Наступленне на Уэску абарвалася.

Мілы, мілы Лукач, няўжо гэта здарылася?

Мы з ім бачыліся ў апошні раз на Гвадалахары, у маленькай вёсцы сярод скал. Старажытная царква прыляпілася на выступе скалы. «Юнкерсы» кружыліся і ракаталі, яны хацелі раздзяўбаць штаб, бамбілі скалы: ён загадаў вынесці карціны з царквы, каб яны не загінулі; разам мы любаваліся наіўным і страсным жывапісам невядомага мастака пятнаццатага стагоддзя — святыя нагадвалі адначасова тарэадораў і закаханых кабалераў. Я сказаў: «А вось, у Маскве ёсць такі венгерскі пісьменнік Матэ Залка, яму-б патрапіць у гэту глуш, у гэтыя казачныя мясціны, апісаць і здаць у Дзяржлітвыдат, вось-бы там яго аблаялі за ўхіл у экзотыку!». Ен смяяўся заразіцельна, па-дзіцячаму: «Факт, аблаялі-б, Міхаіл Ефімавіч, як міленькага!». Ен зайздросціў, што я збіраюся ў Маскву, засумаваў, прасіў абавязкова ўбачыць Веру Іванаўну і Талачку, перадаваў тысячы прывітанняў, непакоіўся наконт кааперацыйнага дома ў Нашчокінскім завулку.

У машыне выняў з партфеля два пісьмы без адраса на канвертах — іх трэба было перадаць асабіста ў рукі камандзіру дванаццатай брыгады, зараз сорак пятай іспанскай дывізіі. Адно пісьмо было заклеена, я паклаў яго назад. У другім, незакрытым, я прачытаў:

«Таварыш старшыня домаўпраўлення! Даношу, што ў нас у доме № 3/5 усё добра. Апальваць спынілі з прычыны вясны. Рамонт фасада пярэдняга — закончан. Баковыя фасады — як былі... Я, таварыш старшыня, замяшчаю вас, як магу. І нават працую з Наталляй Нікалаеўнай — да вашага прыезду. Жыхары вельмі задаволены, яны кажуць, што я, Мацвей Міхайлавіч, ніколькі не горш за цябе працую, і нават пераважаю цябе. Так што прада мною адкрываюцца шырокія перспектывы. А сур'ёзна кажучы, — я па табе знудзіўся і вельмі ганаруся, што ў мяне ёсць такі прыяцель. Міхаіл Ефімавіч перадасць, як цябе любяць. Адзінаццаць чалавек у нас выехалі ў Лаўрушэнскі завулак. Пелікс шле табе паклон. Цалую і ганаруся табою. Мацюша.

Твой Віктар».

Машына пятляла горнымі спіралямі, падымаючыся да Тартосы. Сонца пякло нястрымна. Злева знікла зіхачая блакітнасць Сярэдземнага мора. На крутым павароце мы ледзь не стыкнуліся з сустрэчным аўтамабілем. Ен спыніўся; выйшаў генерал Клебер. Мы знялі цёмныя акуляры, паціснулі адзін другому рукі.

— Я еду прымаць дывізію Лукача,— сказаў ён. — Прыязджай да мяне.

15 ЧЭРВЕНЯ.

Лукача прывезлі. Яго цела выставілі ў вялікай халаднаватай зале былой іезуіцкай семінарыі, дзе цяпер камітэт валенсійскага сялянскага саюза. Вакханалія стракатых паўднёвых кветак вакол яго бледнага, пацямнелага твару. На поўначы кветкі ўмеюць прымаць жалобны, пахавальны выгляд. Тут яны буйна і страсна крычаць аб жыцці, абвяргаюць смерць.

Пад вечар яго пахавалі. Мітынг правялі на вуліцы, у самым цэнтры горада, паміж вакзалам і арэнай для боя быкоў. Затрымаўся рух, трамвайныя званкі і аўтамабільныя гудкі перапынілі прамовы аратараў. Новы глава ўрада Хуан Негрын, новы начальнік генеральнага штаба палкоўнік Рохо стаялі ля труны. Аратары гаварылі аб тым, што доблесны антыфашыст генерал Лукач увайшоў у гісторыю іспанскага народа, як незабыўны герой. Ганаровая варта трымала вінтоўкі накараул. Незлічоны натоўп слухаў моўчкі, скінуўшы галаўныя ўборы.

МІХ. КАЛЬЦОЎ.

*) Урывак з трэцяй кнігі. Поўнасцю друкуецца ў журнале «Новый мир».



ДА ПАДЗЕЙ У ІСПАНІІ

НА ЗДЫМКУ: Дзяўчынка жадае поспеху свайму бацьку, які ідзе на фронт для барацьбы з фашысцкімі варварамі. (СФ).

Луіс-дэ Тапіа

МАРАКАМ

Марак на слаўных караблях!
Спявай радзіме ты іспанскай,
Што славу шумную ў баях
Флот заслужыў рэспубліканскі.

Марак на слаўных караблях!
Скажы краіне загарэлай:
— Сыны «Пацёмкіна» ў баях
Сябе пакарылі славай смелай.

Ты капітан, марак. Зямля
І мора прад табой — не
палахлівы.

Няхай гарматы з карабля
Грымяць па ворагу жахлівым.

Мой спеў, «Сервантэс», аб табе!
Марак з «Лепанда», «Лібертада»!
Насустрач праўдзе, барацьбе
Плылі вы гордаю грамадай.

Ты, Алхесірас, — вечны лаўр!
Тут карабель хай рэспубліканскі
Не дасць, каб высадзіўся маўр,
Разбойнік з бухты Маўрытанскай.

Жыве ў табе і мора даль
І гераізм.
У белай пене,
У пацалунку морскіх хваль
Любімая цябе сустрэне.

Марак, на слаўных караблях!
Скажы краіне загарэлай:
— Сыны «Пацёмкіна» ў баях
Сябе пакрылі славай смелай.

Прышоў жаданы час, марак!
Ты блаславі сваю работу
І вырві руль ў агні атак
Ты з рук благога патрыёта.

Ды караблям бяды не мецы!
І ўноч іх румпы не забудуць.
Ваш шлях вялікі зіхацець
Пяцікандовай зоркай будзе!

Пераклаў Анатоль АСТРЭЙКА.



В. В. МАЯКОЎСКІ ў 1916 годзе

ВЯЛІКІ ГУМАНІСТ

45 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ В. В. МАЯКОЎСКАГА

Г. Бярозкін

Споўнілася 45 год з дня нараджэння вялікага рэвалюцыйнага паэта, аднаго з першых у новым радзе класікаў сацыялістычнага рэалізма, лепшага і таленавіцейшага паэта Совецкай эпохі — Владзіміра Владзіміравіча Маякоўскага.

45 год таму назад у вёсцы Багдады, б. Кутаіскай губерні, у сям'і ляснічага нарадзіўся вялікі паэт соцыялізма. Годы свайго юнацтва Маякоўскі правёў у цеснай блізкасці да падпольных большэвіцкіх арганізацый, у напружанай партыйнай рабоце. Маякоўскі падвяргаўся арышту і заключэнню ў адзіночцы Бутырскай турмы. Пазней сам паэт расказаў аб годах свайго турэмнага зняволення, загартаваўшых душу 16—17-гадовага юнака:

У юношества занятий масса,
Грамматикам учим дурней и дур мы,
Меня-ж из 5-го вышибли класса,
Пошли швырять в Московские тюрьмы.

Усім тым, хто імкнецца апарочыць паэтычную дзейнасць Маякоўскага слоўцамі аб дробнабуржуазным анархізме, эгацэнтрызме, індывідуалізме і іншых «ізмах», раім не забываць аб гэтых годах рэвалюцыйнай дзейнасці Маякоўскага, якія аказаліся добрай школай вывучкі і выхавання.

У 1912 годзе Маякоўскі зблізіўся з рускімі футурыстамі (Д. Бурлюк, В. Хлебнікаў, Е. Гуро, В. Каменскі). Рускі футурызм, школа, узнікшая як рэакцыя супроць пануючага сімвалізма, аб'яднала ў сабе паэтаў розных кірункаў і ўстановак, якіх аднак зблізілі бунтарскія выступленні супроць буржуазна-дваранскага мастацтва. Бунт рускіх футурыстаў з'яўляўся па сутнасці бунтам выключна эстэтычным, паколькі ён быў накіраван на дыскрэдытацыю і нізвяржэнне нянавіснага «эстэтычнага стар'я». Толькі нямногія паэты-футурысты змаглі ўгледзець за нянавісным старым мастацтвам тыя соцыяльна-эканамічныя ўмовы, якія яго параджалі, і рашуча супроць іх выступіць. Сярод гэтых лепшых паэтаў-футурыстаў найбольш віднае месца заняў В. Маякоўскі. Таму ён і стаў вялікім паэтам, у той час як кароткачасовыя яго сябры па футурызму засталіся пры сваіх жоўтых кофтах, якімі яны эпаціравалі буржуа ў сюртуках.

Не гледзячы на тое, што Маякоўскі пачаў сваю дзейнасць у радах футурыстаў, прызнаючы іх фармалістычную літаратурную тэорыю, вершы Маякоўскага на справе абвяргалі абмежаваную і скажоную паэтычную практыку футурызма. Лепшыя творы дарэвалюцыйнага Маякоўскага сведчаць аб тым, што працэс паэтычна-фармальных шуканняў паэта ішоў рука ў руку з працэсам уключэння ў свет вялікага ідэйнага зместу, у свет значных соцыяльных тэм.

Лепшыя дарэвалюцыйныя творы Маякоўскага, такія, як паэмы «Облако в штанах», «Флейта позвоночник», «Война и мир», трагедыі «Человек» і «Владимир Маяковский», адзначаны рысамі страснага пратэсту супроць агіднага ладу буржуазных адносін, у якіх задыхаецца чалавек. У гэтых творах фігурыруе вялікая і багатая чалавечая асоба, індывідуальнасць вялікага росту і вялікага сэрца, чалавек з неймавернай шырынёй думак, жаданняў, страсцей, сіл. Буржуазная рэчаіснасць не ў сілах умясціць чалавечышча такіх маштабаў. Не па росту скроена жыццё. І адсюль адчуванне непатрэбнасці, адчуванне адзіноты:

Какими Голиафами я зачат
такой большой
и такой ненужный?

У Пушкіна, у «Медном всаднике» маленькі чалавечак Еўгеній «грозна спраўляецца» з Пятром Вялікім, які ўвасабляе бязлітасную сілу, што разбурае шчасце Еўгенія. Еўгеній — нешчаслівая афяра гэтага правага, па свойму, гістарычнага працэсу. Гуманізм Пушкіна праявіўся ў тым, што прызнаючы неабходнасць і непазбежнасць гэтага прагрэсіўнага гістарычнага працэсу, ён адначасова напамінаў праваднікам яго аб натуральных чалавечых патрабаваннях народа, які не жадае быць толькі пасіўным аб'ектам няўмольнага руху гісторыі.

Маякоўскі ўзняў і развіў гэтыя вялікія гуманістычныя ідэі Пушкіна. У яго вершах маленькі чалавечак размінае плечы, ператвараецца з выпрабавальнага сродку ў сродак дзейнічаючы. Чалавек з гонарам заяўляе аб сваім усвядомленым пачуцці поўнацэннасці і супроцьстаўляе яго абраным «сильным мира сего»:

Сегодня — я Наполеон...
Он раз чуме приблизился троном,
смелостью смерть поправ, —
я каждый день иду к зачумленным
по тысячам русских Яфф!
Он раз, не дрогнув, стал под пули
и славится столетий сто, —
а я прошел в одном лишь нюле
Тысячу Аркольских мостов!

Кожным радком сваіх твораў Маякоўскі абуджваў у людзях гэтую гордую чалавечую самасвядомасць, якая не можа мірыцца з грамадствам «быкомордой оравы» мяшчан:

Господа!
Остановитесь!
Вы не нищие,
вы не смеете просить подачки!
Нам здоровенным,
с шагом саженьим
надо не слушать, а рвать их...
Мы сами творцы в горящем гимне—
шуме фабрик и лабораторий.

І гэта пачуццё чалавечай поўнацэннасці прадыктавала Маякоўскаму яго бязбожныя настроі, яго паслядоўны і ваяўнічы атэізм. «Чалавек вышэй бога, таму што ён сам бог, бог з мяса і крыві». «Жылы і мускулы малітваў вярней». «Ісус Хрыстос нюхае маёй душы незабудкі»... Усё здаровае, матэрыяльнае, рэчавае, амытае гарачай крывёю, выклікала ў Маякоўскага бясспрэчнае прыкланенне; наадварот, усё божскае, «не тутэйшае», прапахлае ладанам — было яму глыбока нянавісна.

Гуманізм ранняга Маякоўскага праяўляўся ў думцы аб чалавечай поўнацэннасці, у пачуцці фізічнага і духоўнага багацця чалавека, які ва ўмовах капіталістычнага грамадства задушан і заціснут жыццём. Чалавеку ўласціва натуральнае і здаровае жаданне любві. Але любоў Маякоўскага вельмі вялікая для карлікавых маштабаў рэчаіснасці.

У сваіх паэмах «Облако в штанах» і «Флейта позвоночник» Маякоўскі з выключнай паэтычнай сілай перадаў сваё трагічнае адчуванне жыцця і вызначыў шляхі рэвалюцыйнага ператварэння грамадства. Не будучы цесна звязаным з большэвіцкай партыяй, знаходзячыся па-за сферай адкрытых палітычных баёў, Маякоўскі, аднак, стварыў такія паэтычныя творы, якія адыгралі рэвалюцыйную ролю ў справе нізвяржэння рускім пролетарыятам буржуазна-памешчыцкага ладу. Ад думкі аб чалавеку Маякоўскі ішоў да думкі аб рэвалюцыі. Маякоўскі мог сказаць аб сабе словамі другога вялікага пролетарскага гуманіста А. М. Горкага, які заявіў сваім чытачам, што ў п'есе «На дне» мысль аб рэвалюцыі трэба разумець у словах Саціна: «Чалавек гэта гучыць горда!».

У паэзіі Маякоўскага жыла гэта горкаўская ідэя свабоднага і гордага чалавека. Маякоўскі захапляўся багаццем творчых сіл, якія хаваюцца ў чалавеку, яго розумам і сэрцам:

Как-же
себя мне не петь,
если весь я —
сплошная невидаль...

Першы свой верш, прысвечаны рэвалюцыі, Маякоўскі пачаў словамі выдатнага гімна чалавеку:

Верую величью сердца человечьего.

Нельга не ўспомніць і антымілітарыстычную паэму Маякоўскага «Война и мир», у якой паэт супроцьпаставіў крывавай бойні, узнятай імперыялістамі, карціну радаснай чалавечай працы і захапляючую мару аб сусветным братэрстве народаў, у якім:

У капельной девочки
на ногте мизинца
солнца больше,
чем раньше во всем земном шаре.

У гэтай-жа паэме Маякоўскі выказаў сваю цвёрдую ўпэўненасць у тым, што:

Он,
свободный,
ору о ком я,
человек —
придет он,
верьте мне
верьте!

Гэтыя радкі былі напісаны напярэдадні Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі і выражалі прадчуванне рэвалюцыі. Зразумела, што паэта, які напісаў гэтыя радкі, рэвалюцыя не застала знянацку. Усёй сваёй істотай ён быў гатовы з ёй сустрэцца. І глыбока быў правы Маякоўскі, калі ў сваёй аўтабіяграфіі напісаў наступнае: «Прымаць ці не прымаць? Такога пытання для мяне не было. Мая рэвалюцыя. Пайшоў у Смольны. Працаваў».

Рэвалюцыя пазбавіла паэзію Маякоўскага яе трагічнага зместу і ператварыла ў паэзію жыццёсцвярджальных пачуццяў і думак. Яна дала паэту тую станоўчую ідэю, дзеля якой ён некалі ўступаў у канфлікт з мяшчанскім грамадствам. Гэтай ідэяй была ідэя чалавечага шчасця, ажыццяўлёная ў разуменні «соцыялістычная радзіма». І калі гуманізм дарэвалюцыйнага Маякоўскага прыводзіў яго да пафасу адмаўлення існуючага парадку рэчаў, дык, наадварот, той-жа гуманізм і тая-ж бясконцая любоў да жывога, чалавечага, творчага выклікала ў совецкага паэта Маякоўскага пачуццё захаплення і гордасці за сваю краіну, пачуццё радаснай лірычнай ухвалявапасці, выказанай адным словам: «Хорошо!». Не дзіўна, што адзін з лепшых сваіх совецкіх твораў, паэму, прысвечаную 10-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі, Маякоўскі так і назваў, коратка і выразна: «Хорошо!».

Ен гэту паэму лічыў «праграмнай рэччу накшталт «Облака» для тых гадоў» (з аўтабіяграфіі). У ёй з выключнай паўнатой выражана свядомасць чалавека, які адчуў сябе шчаслівым, пачуцці і думкі совецкага чалавека — адданага патрыёта маладой соцыялістычнай бацькаўшчыны. Калі ў «Облако в штанах» выражан вялікі боль паэта за непрыстасаваную да шчасця планету, дык, наадварот, у «Хорошо!» мы адчуваем усю глыбіню новага паэтычнага пафасу Маякоўскага, пафасу сцвярджэння.

У совецкіх вершах Маякоўскага чалавечая індывідуальнасць выступае як актыўна-дзейнічаючая сіла гістарычнага працэсу, як увасабленне яго актыўна-творчай волі. Не маленькі, прыціснуты і задушаны ўмовамі, чалавек і нават не моцная чалавечая індывідуальнасць, пастаўленая ў сілу гістарычных умоў у становішча пасіўнай афяры, а актыўная стваральная асоба, якая адчувае з'яднанасць сваёй асабістай чалавечай волі з воляй усяго народа, з воляй усёй бацькаўшчыны, — такім выступае паэт.

«Правдив и свободен мой вещий язык и с волей советскою дружен», — пісаў Маякоўскі ў некалькі незвычайнай для яго, дэфарміраванай пушкінскай манеры.

Сваімі плакатамі, лозунгамі, частушкамі ў РОСТА, сваімі агітацыйнымі вершамі, сваімі надпісамі, праклаліруючымі совецкую прамысловасць, Маякоўскі выконваў задачу партыі, задачу совецкай улады. Колькі нападак з боку мнімых ахоўнікаў «вечнай» паэзіі заслужыла гэта новая паэтычная дзейнасць Маякоўскага. Усім гэтым ратаборцам ад «мастацтва» Маякоўскі адказваў наступнае: «Так, мне заказваюць тэмы, заданні, матывы. Але я хачу, каб мне заказвалі». Гэты бліскучы адказ ускрывае сутнасць баявой, агітацыйнай паэзіі Маякоўскага.

Паэт пісаў аб усім, што хвалявала яго краіну, яго народ. Але кожная, самая дробная тэма дня асэнсоўвалася ім з пункту погляду агульных задач соцыялізма. Вышэйшым узорам гэтага новага чалавека для Маякоўскага з'яўляўся Ленін — «самый земной изо всех прошедших по земле людей»:

Я себя под Лениным чищу,
чтобы плыть в революцию дальше.

Любоў Маякоўскага да вызваленага соцыялізмам чалавека адначасова выражалася ў пачуцці любві да новай соцыялістычнай радзімы, у нянавісці да яе заклятых ворагаў — фашысцкіх бандытаў, зачыншчыкаў войн, голаду, тыфу, інтэрвенцыі.

На баявых сцягах рэвалюцыйнага пролетарыята заслужылі быць запісанымі радкі вялікага соцыялістычнага гуманіста і патрыёта:

Но землю,
которую
завоевал
и полуживую
вынянчил,
где с пулей встань,
с винтовкой ложись,
где каплей
льешся с массами, —
с такою землею
пойдешь
на жизнь,
на труд,
на праздник
и на смерть.

У ПОЛІ

(Зарысоўкі пра чырвонаармейскую мастацкую самадзейнасць)

Артылерыя біла трапна. Агонь яе быў сакрушальны, дзеянні чоткія. Камандзіры любаваліся вытрымкай байцоў; байцы ідэальна неслі службу; тэхніка дзейнічала беззаганна. У гарачай і напружанай рабоце сям-там чуліся дасціпныя жарты, людзі смяяліся і гэта надавала яшчэ больш бадзёрасці, узнімала настрой.

Але вось трубы праспявалі адбой, вучэнне скончылася і батарэі занялі на паляне паміж ракою і жывапісна раскінуўшымся лесам бівак.

У традыцыі гэтай часці быў дэвіз— «не траціць дарэмна часу» — і, яшчэ не насталі прыцемкі, як пачаўся палявы чырвонаармейскі канцэрт. У цэнтр паляны спяшаліся ўсе музыканты, спевакі, запейнікі, гарманісты. Малодшы камандзір Зайцаў хваляваўся больш за ўсіх, — ён кіраўнік самадзейнага аркестра, удзельнікі яго ва ўсіх падраздзяленнях часці, — а, можа, хто-небудзь і не з'явіцца, скажам, галоўны баяніст, які ў полі замяняе піяніста, — тады «славуты і непераможны да гэтага часу» аркестр павінен будзе распісацца ў бяссіллі... Але па яго твары ўжо бяжыць усмешка. Адзін за другім з'явіліся ўсе.

Блакітнае неба, зялёная паляна, сотні байцоў ляжаць, размясціўшыся па паляне пасля сытнага абеду. Уважліва слухаюць яны за выступленнямі самадзейных артыстаў.

Першым выступіў самадзейны аркестр у складзе 60 чалавек. Аркестр сёння падрыхтаваў сюрпрыз. Толькі два дні таму назад у «Правде» была надрукавана «Песня артылерыстаў» (музыка бр. Покрас, тэкст Лебедзева-Кумача), а сёння гэта песня ўжо развучана і выконваецца, нават з аркестровым суправаджэннем.

«Песня артылерыстаў» была сапраўды нечаканым і прыемным сюрпрызам. Доўга не сціхалі апладысменты, кіраўнік—малодшы камандзір Зайцаў—усміхаўся.

Выступленне аркестра доўжылася хвілін 20. Праграма складалася з баявых і лірычных совецкіх песень. Тут былі і «Казачая» Покрас, і «Песня аб Шчорсе», і рытмічныя «Мінуткі», і мелодыі з фільмаў «Шукальнікі шчасця» і «Тры парасёнкі».

Аказваецца, на машыне прыехалі жонкі камандзіраў і другім нумарам проста на трасе ішла толькі-што падрыхтаваная новая пляска—руская «Канава», а потым пайшлі баяністы, спевакі пад баян, апавядальнікі, «агляддчыкі падзей» сёнешняга дня. Шум, смех, весялосць. Спадаў ужо позні змрок, калі на паляну выйшлі частушачнікі, не багата—не мала, чалавек 70. Яны сваёй жыццёрадаснасцю, непрымушанасцю яшчэ больш улілі весялосці ў байцоў, і першыя словы частушкі падхапіла ўся паляна:

Боевой мы шлем привет
Родному и любимому
Маршалу Страны Советов
Климу Ворошилову.

Людзі ўсталі і словы гэтыя прагучалі як магутная радасць вялікага калектыва. Частушка гучыць не толькі на паляне, але і разносіцца па далёкіх ваколіцах, гучыць грознай перасцярогай ворагам:

«СССР—не государство»—
Врут фашисты на весь свет:
Если-ж сунутся—узнают:
Государство или нет.

Потым танцавалі. І толькі калі сцямнела, бівак засынаў моцным сном. Але ўсё яшчэ сям-там можна было пачуць матыў новай песні артылерыстаў.

***

У сувязістаў сёння быў цяжкі дзень. Дзесяткі кіламетраў пракладзенага на лесе, палях і ярах кабеля. Камандаванне аб'яднання адзначыла добрую работу сувязістаў. Абедалі пасля вучэння позна, калі ўжо цямнелася, некаторыя засыналі ля казанка.. Але ў цэнтры начлегу зайграў баян.. І наўрад ці да сну ўжо тут! На баян сабраліся ўсе, а яшчэ праз некалькі хвілін каля баяна выраслі харысты і балалаечнікі, і без усякага запрашэння лейтэнант Грынчэнка пачаў праграму свайго хора, заняўшы дырыжорскае месца.

Каштоўнасць хора ў тым, што ён не сабран з усёй часці, а прадстаўляе з сябе поўнасцю роту ў страявым складзе. Аркестр балалаек, на чале з баянам, прагучаў першымі акордамі і грымнула «Песня аб Сталіне». Гэта была вядомая песня Рэвуцкага. Слухачы прынялі яе ва ўрачыстым маўчанні і па заканчэнні ўзнагародзілі выканаўцаў бурнымі апладысментамі.

Хор прадэманстраваў вялікую праграму песень грамадзянскай вайны і харавых твораў совецкіх кампазітараў. Хор безумоўна добры, ён сведчыць аб тым, што кожнае падраздзяленне можа і павінна дабівацца добрага, прыгожага выканання строем харавога рэпертуару чырвонаармейскай і совецкай песні.

Бівак спаў. Раніцой уся часць у адзіным магутным ансамблі пачала паход словамі:

Если завтра война, если завтра поход,—
Будь сегодня к походу готов!

***

Кавалерысты ў сваёй самадзейнасці любяць чым-небудзь здзіўляць слухачоў. І сапраўды, на прывале ўдзень байцы аднаго палка—славутыя тапоры—выкінулі нумар, аб якім потым гаварылі ў многіх часцях.

Пасля абеду настала цішыня. Раптам, адкуль ні вазьміся, заспявала сігналка. Сігнал такі, не па часу, дзіўны: «Стой!» Што за чорт! Ідуць чалавек пятнаццаць байцоў, наперадзе баяніст, і спяваюць: «Полюшко поле...» Народ расступаецца, дае ім дарогу. Баяніст сеў і раптам пачалася пляска. І якая пляска! То барыня, то рускі, то цыганачка, то калінка, то нейкая стэпавая мелодыя. Байцы, а за імі два лейтэнанты прадэманстравалі безліч варыянтаў пляскі. Скончылася ўсё сігналам: «На коней» і воклічам «Плясаць умеем добра, а з ворагам б'ёмся выдатна». І толькі пасля гэтага байцам было абвешчана, што адбылося выступленне зацейнага калектыва кавалерыйскіх плясак. Апладысменты былі такія моцныя, што пляску прыйшлося паўтарыць.

Самадзейная чырвонаармейская творчасць з'яўляецца штодзённым спадарожнікам кожнай часці, сродкам умацавання баявой сілы Чырвонай Арміі. Яна—сябра чырвонаармейца на паходах і вучэннях. А калі будзе вайна, калі вораг нападзе—яна стане ў строй для абароны радзімы і вялікага сталінскага закона як сіла, што дапамагае Чырвонай Арміі біць і адбіваць ворагаў.

Улад. МУРАТ.

Насустрач XX-годдзю ВЛКСМ

НОВЫЯ ТВОРЫ МАСТАЦТВА— У ПАДАРУНАК РАДЗІМЕ

З вялікай радасцю і энтузіязмам сустрэла ўся шчаслівая совецкая моладзь гарачы заклік маладых рабочых і спецыялістаў аўтазавода імя Сталіна: да раднаснага свята XX-годдзя ленінска-сталінскага комсамола падрыхтаваць і паднесці падарункі сваёй маці-радзіме.

«Кожны такі падарунак павінен быць варты слаўнай гадавіны. Няхай ён нясе ў сябе найвышэйшае творчае напружанне волі і розуму, страсці і старання маладых патрыётаў радзімы»,—пішуць аўтазаводаўцы.

Ні адзін малады работнік совецкага мастацтва, як і ні адзін малады совецкі патрыёт, які працуе ў любой іншай галіне, не можа застацца роўнадушным да гэтага закліку. Як не быць удзячнымі вялікай соцыялістычнай радзіме нам, выхаваным на свабоднай совецкай зямлі, нам — самаму шчасліваму ў гісторыі маладому пакаленню, чыё радаснае маленства і юнацтва расквітаюць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі!

Ей — вялікай партыі большэвікоў, яе геніяльным правадырам Леніну і Сталіну совецкая моладзь абавязана ўсім.

І бязмежна жаданне кожнага маладога совецкага патрыёта як можна лепш працаваць і расці, як можна больш карысці прынесці сваёй радзіме, сваёй комуністычнай партыі, адзначыць сваё свята новымі справамі, новымі перамогамі ў справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Мы — работнікі Дзяржаўнага тэатра юнага гледача БССР, — тэатра, узнікненне якога стала магчымым толькі пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Шчаслівая совецкая моладзь — наш глядач. І самі мы — выхаванцы совецкай школы, большая частка з нас выхавана комсамолам. Да радаснага свята XX-годдзя ленінска-сталінскага комсамола мы ўсе з вялікім энтузіязмам будзем працаваць над сваім падарункам — спектаклем «Два браты», які пакажа гераічнае змаганне комсамола ў краінах капіталізма супроць фашысцкай дыктатуры. Мы абавязуемся да свята паказаць гэты спектакль гледачу, дабіцца таго, каб у гэтым спектаклі ўсе творчыя магчымасці членаў нашага калектыва былі раскрыты і выкарыстаны да канца.

Аднвачасова абавязуемся разгарнуць унутры калектыва індывідуальнае спаборніцтва на стварэнне ў падарунак да слаўнага свята лепшых мастацкіх вобразаў у спектаклі «Два браты».

Мы заклікаем усіх маладых актораў і рэжысёраў БССР, усіх маладых работнікаў совецкага мастацтва нашай рэспублікі: рыхтуйце падарункі маці-радзіме; уложым у фонд XX-годдзя комсамола наш дар — новыя высокія творы мастацтва, якія-б выхоўвалі ў комуністычным духу маладое пакаленне, якія клікалі-б да новых заваёў комунізма.

Мы звяртаемся асобна да пісьменнікаў Совецкай Беларусі: стварыце п'есы пра гераічны комсамол, пакажыце ў драматургічных вобразах слаўных прадстаўнікоў сталінскай моладзі, — смелай, адважнай, жыццёрадаснай, бязмежна адданай справе партыі Леніна—Сталіна.

Стварыце п'есы для нашых шчаслівых дзяцей.

Гэта ваш святы абавязак перад радзімай!

Няхай святкаванне XX-годдзя баявога памочніка большэвіцкай партыі — комсамола — выкліча новы, магутны ўздым у развіцці нашага соцыялістычнага мастацтва!

КАЛЕКТЫЎ РАБОТНІКАЎ ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА БССР.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЮБІЛЕЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА НА УКРАІНЕ

9 сакавіка 1739 года спаўняецца 125 год з дня нараджэння вялікага украінскага паэта-дэмакрата Тараса Грыгор'евіча Шаўчэнкі. Гэты слаўны юбілей будзе святам не толькі для шчаслівага украінскага народа, з гушчы якой выйшаў таленавіты паэт-кабзар. Юбілей Шэўчэнка будзе святам усяго совецкага народа.

Для таго, каб належным чынам падрыхтаваць правядзенне юбілейных дзён, урад Совецкай Украіны ўжо цяпер стварыў спецыяльны камітэт. Па пастанове прэзідыума ЦВК Украіны старшынёй камітэта па правядзенню 125-гадовага юбілея з дня нараджэння Т. Г. Шаўчэнкі з'яўляецца адказны сакратар праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны тав. Карнейчук. У члены камітэта ўведзены: другі сакратар ЦК КП(б)У тав. Бурмістэнка, старшыня Соўнаркома УССР тав. Каротчэнка, прэзідэнт Акадэміі навук Украіны тав. Багамолец, акадэмік тав. Праскура, пісьменнік тав. Панч, паэт тав. Рыльскі і іншыя.

Аднвачасова праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны стварыла шэўчэнкаўскі юбілейны камітэт. Гэтымі днямі адбылося першае пасяджэнне гэтага камітэта.

Акрамя членаў камітэта, на пасяджэнні прысутнічаў актыў пісьменніцкай арганізацыі сталіцы Украіны. Камітэт распрацаваў рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да юбілейных дзён. У прыватнасці, крытычнай секцыі саюза пісьменнікаў даручана неадкладна прыступіць да напісання гістарычна-літаратурных, крытычных твораў аб рэволюцыйнай і творчай дзейнасці Т. Г. Шэўчэнкі, аб яго жыцці.

Каб садзейнічаць папулярызацыі твораў Т. Г. Шэўчэнкі сярод братніх народаў СССР, камітэт намеціў практычныя мерапрыемствы. Сярод іх ёсць і такія: запрасіць у Ірпенскі дом творчасці Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны (каля Кіева) паэтаў братніх рэспублік, якія будуць перакладаць на розныя мовы творы Т. Г. Шэўчэнкі. Намечан таксама рад прапаноў па ўвекавечанню памяці вялікага народнага паэта.

Вс. ГАЛЕНКА.

КНІГА АБ СОВЕЦКІМ ПАТРЫЯТЫЗМЕ

Разам з лепшымі творамі беларускай совецкай літаратуры аб гераічнай Чырвонай Арміі зборнік «Чырвоная Армія і абарона радзімы ў народнай творчасці» з'яўляецца яркім сведчаннем таго, што гераічны шлях Чырвонай Арміі і яе баявыя справы захапляюць сваёй велічнасцю, і народ, песцячы сваю родную армію, як сваіх родных дзяцей, складае ў імя яе песні, легенды, частушкі, мужныя і простыя, як само жыццё Чырвонай Арміі, велічныя і простыя, як велічна і проста жыццё і змаганне лепшых сыноў народа, легендарных правадыроў і палкаводцаў Чырвонай Арміі.

Таму ў гэтым зборніку цэнтральнае месца займаюць вобразы таварышаў Леніна і Сталіна, як правадыроў партыі і арганізатараў перамог Чырвонай Арміі; вобраз народнага палкаводца, першага маршала совецкага народа Клімента Ефрэмавіча Варашылава, палкаводца слаўнай чырвонай конніцы Сямёна Будзённага, легендарнага народнага героя Чапаева.

Надзвычай проста, праўдзіва і шчыра народныя песняры і казачнікі раскрываюць вобразы найвялікшых геніяў чалавецтва—Леніна і Сталіна ў кіраўніцтве Чырвонай Арміяй, у арганізацыі яе выдатных перамог над шматлікімі ворагамі, уператварэнні яе ў першакласную армію народа, лепшую армію ва ўсім свеце.

У самыя цяжкія часы грамадзянскай вайны, калі над краінай Советаў згушчаліся хмары, а чорная зграя інтэрвентаў і ўнутранай контррэволюцыі прагнула крыві працоўных, імкнучыся знішчыць маладую Совецкую рэспубліку, у гэты момант на самыя адказныя ўчасткі грамадзянскай вайны Владзімірам Ільічом пасылаецца лепшы яго саратнік таварыш Сталін.

У «Быліне аб мудрым воіне Кліме і яго таварышах» у манументальнай прастаце і багатырскай велічнасці паўстае вобраз таварыша Варашылава:

І не біўся так Ілья Мурамец,
А ні князь Алег, як наш воін Клім.

Вось таму, апяваючы гераічныя паходы таварыша Варашылава, народ спявае:

А калі на нас пасмее
Злы фашыст падняць тапор,
З Варашылавым здалеем
Яшчэ лепшы даць адпор.

І як волат-багатыр апяваецца ў народных песнях таварыш Будзённы:

А Будзённы сам на ліхім кані
Едзе по полю са дружынаю,
Едзе по полю, едзе по лесу,
Разбівае войска варожае.

Змаганне слаўнай чырвонай конніцы пад кіраўніцтвам тав. Будзённага надзвычай маляўніча, у былінным стылі, перадаюць байцы Чырвонай Арміі, гераічныя будзёнаўцы так:

Наперадзе сам Будзённы
Б'ецца смела, храбра,
Прыпадае конь да полу
Ды варонай масці.

Гераічны шлях Першай коннай ярка перадаецца ў такіх скупых радках:

Выходзіла маладосць
У шабельны паход, —
На полі Украіны,
На кранштадскі лёд.

Песню запявала
На палях Урала,
Славу узнімала
На сваіх клінках.

Провады ў Чырвоную Армію ў нас ператвараюцца ў народнае свята, таму што працоўныя любяць сваю армію, песцяць яе, дапамагаюць ёй абараняць свяшчэнныя рубяжы краіны Советаў. Вось чаму провады ў Чырвоную Армію зусім не падобны на провады ў старую царскую армію: яны радасць для бацькі і маці, яны гонар для каханай:

Рада маці, рад і бацька,
На граніцу сын ідзе.

— Ды глядзі-ж, сынок мой мілы,
Стой там моцна, як нідзе.

І зусім іншыя лірычныя песні спявае дзяўчына аб сваім каханым:

Спявала дзяўчына
У садзе зялёным,
Што мілы на варце
Граніцы чырвонай.

Вобраз маці, якая рада за шчасце сваіх дзяцей, што служаць у Чырвонай Арміі, даволі шырока асветлен у народнай лірыцы. І як далёкі гэты вобраз ад маці, выплакаўшай «вочкі па сваіх сыночках», якіх яна адпраўляла ў царскую армію, на імперыялістычную вайну.

Рада, рада была маці
Седзячы ў святліцы,
Сам старэйшы маці кажа:
— Стаю на граніцы.
... Другі сын яе, малодшы,
Што быў брыгадзірам,
Ён у Арміі Чырвонай
Цяпер камандзірам.

Па гэтаму мары кожнай маці аб тым, каб яе сын абавязкова меў гонар служыць у Чырвонай Арміі:

— Вырасцеш, сынок, вялікі,
Пойдзеш ў армію служыць,
Сам таварыш Варашылаў
Будзе там цябе вучыць.

Бо:

Мая мама вельмі рада,
Што я ў армію пайшоў:
Адыходзіў непісьменны —
Камандзірам я прышоў.

Чырвоная Армія — універсітэт для байца: яна, насычаная складанай тэхнікай, патрабуе ад кожнага чырвонаармейца ўпартай вучобы, яна вучыць байца класавай пільнасці, прывівае любоў да кнігі, выяўляе яго мастацкія таленты і ў першую чаргу выхоўвае ў байца совецкі патрыятызм, адданасць сваёй радзіме і гатоўнасць у любы момант аддаць жыццё за яе. Вось чаму яна так багата народнымі героямі, як Карабіцын, Лагода, Васілій Кацельнікаў, якія самаахвярна аддалі сваё жыццё, абараняючы нашы граніцы, вось чаму замест загінуўшых таварышоў з фабрык і калгасаў добраахвотна ідуць на абарону совецкіх рубяжоў сотні маладых совецкіх патрыётаў. І гэта так праўдзіва і маляўніча апявае народ у сваёй творчасці.

Ворагі працоўнага народа, прэзрэнная банда фашысцкіх наймітаў, трацкісцка-зіноўеўска-бухарынская сволач, імкнуліся ператварыць Совецкі Саюз у калонію фашысцкіх дзяржаў. Але органы совецкай улады адсеклі галаву фашысцкай гадзіне, і ўвесь совецкі народ у любы момант гатоў даць адпор усім тым, хто пасмее соваць сваё свіное рыла ў наш совецкі агарод.

У народных песнях і былінах, казках і сказах Чырвоная Армія і абарона радзімы знайшлі шырокае адлюстраванне. І ў зборнік, трэба думаць, увайшла нязначная частка з таго, што стварыў народ пра сваю любімую гераічную армію. Але і тое, што змешчана ў зборніку, з'яўляецца значным укладам у жалезны фонд беларускай мастацкай літаратуры.

Сталінская Канстытуцыя, запісаўшы правы і абавязкі грамадзян Совецкага Саюза, натхняе народ на стварэнне новых песень і сказаў аб таварышу Сталіне, аб Чырвонай Арміі і свяшчэнным абавязку кожнага грамадзяніна—абараняць сваю радзіму да апошняй кроплі крыві.

Золатам па шоўку
Словы запісала,
За закон цудоўны
Дзякуй табе, Сталін.

Такія зборнікі народнай творчасці, як «Ленін і Сталін у беларускім фальклоры», «Чырвоная Армія і абарона радзімы», патрэбна толькі вітаць. Патрэбна пажадаць, каб выдавецтва і ў першую чаргу фальклорная секцыя Акадэміі навук БССР шырэй заняліся збіраннем і выданнем усяго таго, што беларускі працоўны народ стварыў за 20 год існавання краіны Советаў.

М. КАРПАЧОЎ.

ЛЕСЯ УКРАІНКА

(ДА 25-ГОДДЗЯ З ДНЯ СМЕРЦІ).

Стагнала пад царскім ботам Украіна, плакала гаротнымі слязьмі. Потам і крывёю украінскага народа былі паліты ўраджайныя палі, шляхі яе падмяталі кайданы — гэта лепшых сыноў украінскага народа гналі царскія паслугачы ў Сібір, а тыя з лепшых, што не пайшлі ў Сібір, запоўнілі вузкія турэмныя камеры.

Адзвінела шэўчэнкава кобза, абарвалася. Падхапілі яе іншыя кабзары, і зноў паплылі над зямлёй украінскай песні, поўныя болю і суму аб нядолілёсе людскім. То рыдалі гэтыя песні, то заклікалі народ да барацьбы.

І вось у 1884 годзе да песень кабзароў далучаецца малады голас 12-гадовай дзяўчынкі, спачатку нерашучы, трохі баязлівы, а потым упэўнены, заклікаючы.

Гэты голас належаў Лесі Украінцы (літаратурны псеўдонім) — Ларысе Пятроўне Касач, па мужу Квітко.

Нарадзілася Леся ў 1872 годзе ў сям'і небагатага памешчыка і атрымала добрую адукацыю. Яе маці была вядомая украінская пісьменніца (літаратурны псеўдонім Олена Пчылка). З малых год пачала пісаць Леся, спачатку пад уплывам матчынай паэзіі, потым пад уплывам Шэўчэнкі і іншых.

Але асноўны шлях развіцця творчасці паказаў Лесі яе дзядзька, вядомы украінскі публіцыст Драгаманаў. Ён пазнаёміў яе з еўрапейскай навукай і літаратурай; ён супроцьпаставіў прымітыўнаму нацыяналізму погляды на аснове касмапалітызму: «трэба шукаць сусветнай праўды, якая была-б сугучнаю для ўсіх нацыянальнасцей»; ён даў ёй зразумець, якія грамадскія абавязкі ляжаць перад маладым пакаленнем, да якога належала Леся; ён звярнуў яе ўвагу на рабочы клас і сялянства.

Належачы да таго пакалення украінскай інтэлігенцыі, якое не магло заставацца толькі на драгаманаўскіх пазіцыях, Леся зрабіла з гэтай тэорыі адпаведныя вывады, прывёўшыя яе ад народніцкага радыкалізма да першага украінскага соцыял-дэмакратычнага згрупавання. А таму і пазнейшая творчасць Лесі Украінкі носіць у сабе ідэі дэмакратыі, ідэі вызвалення народных мас ад капіталістычнага ярма, таму ў некаторых сваіх вершах («Славус — склавус» (славянін—раб) і інш.) яна адкрыта смяецца з людзей, якія баязліва гнуць сваю спіну «перад слупом у кароне і называюць яго царом».

Апрача ўплываў украінскіх паэтаў, лірыка Лесі Украінкі носіць на сабе глыбокі і выразны адбітак еўрапейскіх паэтаў і асабліва Гейне.

Сусветны лірык, вялікі мастак, чалавек рэволюцыйнай думкі, які ненавідзеў буржуазны мяшчанскі лад Германіі,—Гейне быў пратэстантам, узброеным іроніяй рэдкай па сваёй сіле.

Леся ўспрыняла навуку Гейне і перажыла яе па-свойму, змякчыла сваім жаночым лірызмам, але ў некаторыя моманты ўзнімалася да сілы іроніі Гейне.

В мужика землянка вохка,
В пана хата на помості,
Що-ж, не дарма люди кажуть,
Що в панів білішні кості.

У мужички руки чорні,
В пані рученька тендітна;
Що-ж, не дарма люди кажуть,
Що в панів і кров блакитна!

Мужики цікаві сталі,
Чи то кості білі всюди,
Чи блакитна кров поллеться,
Як пробити нашу груди?

(Паэма «Давня казка»).

Гэтыя 12 радкоў сілай сваёй соцыяльнай іроніі вытрымаюць параўнанне з лепшымі радкамі Гейне.

Але разам з уплывам Гейне на паэзію Лесі Украінкі мы тут-жа заўважаем і ўплывы іншых першарадных еўрапейскіх і рускіх паэтаў, у прыватнасці Байрана, Гюго, Шылера, Міцкевіча, Пушкіна, Лермантава, Некрасава.

Гэтыя вялікія людзі навучылі яе любіць свой народ, сваю прыгнечаную радзіму, навучылі паэтычным словам запальваць сэрцы людзей, кідаць заклік да барацьбы.

Носячы ў сэрцы сваім мару аб тых часах, калі яна зможа ўбачыць шчаслівым і свабодным украінскі народ, яна ўпікала маладое пакаленне 90-х гадоў у баязлівасці і слабасці, але яна бачыла, яна адчувала, як накіпае народны гнеў, і верыла, што прыдзе час — успыхне народны гнеў, змяце ўсё на сваім шляху і народ выйдзе пераможцам у барацьбе з царызмам.

Яна пісала:

Так, ми раби, не має гірших в світі!
Феллагі, парії щасливіші від нас,



ЛЕСЯ УКРАІНКА ў нацыянальным гарнітуры

Бо в них і розум, і думки сповиті,
А в нас вогонь Тітана ще не згас...

Высмейваючы намеры спакой тагочаснай інтэлігенцыі, якім прыкрывала яна сваю баязлівасць перад царскім тронам, Леся пісала:

Коли-б кайданів брязкіт мог ударить
Перуном в тії заспані серця,
Спокійні чола соромом захмарить
І нагадать, що зброя жде борця...

Цяжкая хвароба прымушала Лесю занадта часта выязджаць за граніцу на лячэнне, але і там яна ўвесь час думала аб сваёй закатаванай радзіме, аб сваім народзе, аб яго шчасці і волі.

Вільні співи, гучні, голосні
В рідним краї я чути бажаю, —
Чую скрізь голосіння сумні!
Ох, невже в тобі, рідний мій краю,
Тільки й чуються вільні пісні —
У сні?

Вядомы украінскі палітычны дзеяч і пісьменнік І. Франко так пісаў аб Лесінай паэзіі.

«З часу шэўчэнкаўскага «Поховайте та вставайте, кайдани порвіте» Украіна не чула такога моцнага, палкага і паэтычнага слова, як з вуснаў гэтай слабасільнай, хворай дзяўчыны. Праўда, украінскія эпігоны Шэўчэнкі не раз «ірвалі кайданы», прадвяшчалі волю, але гэта звычайна былі фразы, было пераджоўванне не так думак, як літаратурных зваротаў і вобразаў вялікага Кабзара... Яшчэ раз паўтараю: чытаючы мяккія і разнерваваныя пісанні сучасных маладых украінцаў-мужчын і параўноўваючы іх з тымі бадзёрымі, моцнымі і смелымі, прытым такімі простымі, словамі Лесі Украінкі, мімаволі думаеш, што гэтая хворая, слабасільная дзяўчына—ці не адзінокі мужчына на ўсю новачасную Украіну».

У канцы першага свайго перыяду творчасць Лесі Украінкі мела дзве тэндэнцыі: першую — да вялікага эпічнага жанру (раннія паэмы), другую — да драмы (маналогі і дыялогі). Цікава адзначыць, што спецыфічна-высокі тон вершаванай мовы сваёй лірыкі Леся перанесла да сваіх вершаваных драм. У гэтым разуменні творчы шлях яе быў жанрава-рознастайным, а стылістычна адзіным, вытрыманым.

Пазнейшая драматычная творчасць Лесі, самастойная і арыгінальная засталася далёка нясконачанай. Бліскучы росквіт гэтай творчасці ў апошнія гады жыцця паэтэсы быў велізарны, тытанічны. Кожны новы твор яе вызначаў новую стадыю.

Для кожнага, хто знаёмы з усёй творчасцю Лесі Украінкі, ці з большасцю яе твораў, творчы шлях яе высвятляецца сам сабою. Яна з маладых год адчула ў сабе пісьменніка, усё жыццё была пісьменнікам і скончыла сваё жыццё з пяром у руках.

Лірыка Лесі стварыла пераварот ва украінскай паэзіі ў бок развіцця яе культуры, інтэрнацыяналізма і соцыяльных задач. Гэтай лірыкай прасякнута ўся творчасць сучасных украінскіх паэтаў П. Тычыны і М. Рыльскага — паэтаў сонечнай Совецкай Украіны, якая пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе геніяльнага правадыра, любімага ўсімі народамі СССР таварыша Сталіна ідзе да агульнай заветнай мэты — комунізма.

Леся не пачула Кастрычніцкага грому, навекі скінуўшага рабскае ярмо з украінскага народа. Не пачула яна магутных песень аб радасці і шчасці свабоднага украінскага народа — народа, аб якім так пакутавала. 19 ліпеня 1913 года Леся Украінка памёрла, не дажыўшы чатырох год да Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

К. ЦІТОЎ.

ПРЫЁМ У ТЭАТРАЛЬНАЕ ВУЧЫЛІШЧА БССР

Першае тэатральнае вучылішча Совецкай Беларусі, якое пачне сваю работу ў верасні гэтага года, зараз праводзіць набор студэнтаў. На адрас вучылішча паступіла звыш тысячы пісем з запросамі аб прыёме. Каля 400 чал. моладзі з усіх канцоў Совецкага Саюза будзе ўдзельнічаць у конкурсных іспытах. Сярод людзей, якія жадаюць працаваць у галіне акторскай творчасці, ёсць рускія, беларусы, украінцы, палякі, армяне, узбекі і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей СССР. Усе гэтыя людзі — наша шчаслівая моладзь, актывісты мастацкай самадзейнасці, маладыя таленты, узрошчаныя радзімай соцыялізма. Сярод жадаючых паступіць у вучылішча шмат моладзі з калгасаў, заводаў, фабрык, навучальных устаноў.

У канцы жніўня пачнуцца прыёмныя іспыты. У вучылішча мяркуецца прыняць 70 чалавек.

Зараз укамплектоўваюцца штаты педагогаў. Да выкладання ў вучылішчы прыцягваюцца беларускія рэжысёры Рахленка, Зораў і Галаўчынер. Таксама будуць прыцягнуты педагагічныя тэатральныя сілы з Масквы і Ленінграда. На паасобны цыкл лекцый па акторскаму майстэрству і іншых дысцыплінах будуць запрашацца выдатныя майстры сцэны совецкіх тэатраў.

Дрэнна абстаіць справа з інтэрнатам для студэнтаў. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна паклапаціцца аб жыллёвых умовах навучаючыхся.

Не лепш абстаіць справа з памяшканнем, дзе размесціцца вучылішча. Соўнарком БССР абавязаў будаўнікоў Вялікага тэатра закончыць засцэннае памяшканне да 20 ліпеня, але тэмпы работы ўжо сёння паказваюць, што заданне ўрада зрываецца. Неабходна мабілізаваць будаўнікоў тэатра такім чынам, каб памяшканне для тэатральнага вучылішча было закончана не пазней як у канцы ліпеня, бо ад гэтага залежыць уся далейшая работа першай навучальнай тэатральнай установы БССР.

Мала аддае ўвагі беларускаму тэатральнаму вучылішчу вучэбнае ўпраўленне Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў. Да гэтага часу яшчэ не прысланы ўсе праграмы, без якіх нельга будзе пачаць навучальны год.

Кіраўнікі беларускай кінематаграфіі вядуць перагаворы з прадстаўнікамі Упраўлення па справах мастацтваў і дырэкцыі вучылішча адносна таго, каб побач з падрыхтоўкай тэатральных акторскіх кадраў вучылішча ўзяло на сябе падрыхтоўку маладых кіноактораў. Паколькі ў далейшым вучылішча безумоўна будзе вучэбным камбінатам, дык далучэнне актораў кіностудыі з'яўляецца патрэбным мерапрыемствам.

А.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Г—4726.